**Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь**
**Вучэбна-метадычнае аб'яднанне па гуманітарнай адукацыі**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
________ В. А. Богуш
07.09.2015
Рэгістрацыйны № ТД-D.354 /тып.

# ГІСТОРЫЯ ЛІТАРАТУРЫ КРАІНЫ ВЫВУЧАЕМАЙ МОВЫ (Гісторыя польскай літаратуры)

**Тыпавая вучэбная праграма**
**па вучэбнай дысцыпліне**
**для спецыяльнасці**
**1-21 05 04 “Славянская філалогія”**

УЗГОДНЕНА
Старшыня Вучэбна-метадычнага аб'яднання па гуманітарнай адукацыі
________ Данільчанка
"31" 03" 2015 года

УЗГОДНЕНА
Начальнік Упраўлення вышэйшай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
________ С. І. Раманюк
07.09.2015

Прарэктар па навукова-метадычнай рабоце Дзяржаўнай установы адукацыі “Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы”
________ І. У. Цітовіч
20.08.2015

Эксперт-нормакантралёр
________ В.К. Кісялёва
10.07.2015 г.

Мінск 2015

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

**С. П. Мусіенка** – прафесар кафедры польскай філалогіі філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі “Гродненскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы”, доктар філалагічных навук, прафесар;

**В. А. Хораў** – загадчык сектара Інстытута славяназнаўства Расійскай акадэміі навук, доктар філалагічных навук, прафесар;

**М. М. Хмяльніцкі** – дацэнт кафедры славянскіх літаратур філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

**А. І. Білютэнка** – дацэнт кафедры польскай філалогіі філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі “Гродненскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

**А. П. Нялепка** – страшы выкладчык кафедры польскай філалогіі філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі “Гродненскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы”;

**Яраслаў Лаўскі** – загадчык кафедры міждысцыплінарных даследаванняў “Усход-Захад” Беластоцкага ўніверсітэта, доктар хабілітаваны, прафесар;

**Анна Кежунь** – прафесар Беластоцкага ўніверсітэта, доктар хабілітаваны;

**Анна Яніцка** – дацэнт Беластоцкага ўніверсітэта, доктар;

**А.В. Гук** – аспірант установы адукацыі “Гродненскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы”, магістр філалагічных навук.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Кафедра сусветнай літаратуры і замежных моў установы адукацыі “Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт”;

**Л. У. Пярвушына** – дацэнт кафедры замежнай літаратуры ўстановы адукацыі “Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**

Кафедрай славянскіх літаратур філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, пратакол № 6 ад 26 лютага 2015 г.;

Навукова-метадычным саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, пратакол № 4 ад 27 сакавіка 2015 г.;

Навукова-метадычным саветам па філалагічных навуках Вучэбна-метадычнага аб'яднання па гуманітарнай адукацыі, пратакол № 5 ад 31 сакавіка 2015 г.

Адказны за рэдакцыю: С.П.Мусіенка
Адказны за выпуск: М.М.Хмяльніцкі

# І. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна "Гісторыя літаратуры краіны вывучаемай мовы (Гісторыя польскай літаратуры)" прадугледжана стандартам і тыпавым вучэбным планам падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці 1-21 05 04 "Славянская філалогія" (кваліфікацыя: "Філолаг. Выкладчык славянскіх моў і літаратур (з указаннем моў і літаратур). Перакладчык").

Праграма ахоплівае гісторыю развіцця польскай літаратуры ад вытокаў да сучаснасці (пачатак XXI ст.). Літаратурны працэс у праграме асэнсоўваецца як цэласная сістэма нацыянальнай культуры Польшчы і як сутнасная частка сусветнага літаратурнага працэсу. Асаблівая ўвага надаецца праблемам пераемнасці традыцый і сувязяў паміж асобнымі перыядамі развіцця літаратуры, таму апорным ў праграме з'яўляецца аналіз ідэйна-мастацкіх, праблемна-тэматычных і эстэтычных асаблівасцей кожнай эпохі, у рэчышчы і кантэксце якой прадугледжваецца аналіз творчасці і біяграфічныя звесткі прадстаўнікоў дадзенай эпохі і дадзенай літаратуры, асабліва тых, якія вызначаюць яе характар, і аналіз літаратурных твораў з раскрыццём іх мастацка-светапогляднай значнасці, месца ў сусветным і нацыянальным літаратурных працэсах (метад, стыль, ідэйна-эстэтычная адметнасць, гуманістычны пафас творчасці пісьменнікаў і асобнага твора).

Аўтары-складальнікі праграмы палічылі мэтазгодным звярнуць увагу на цэласны аналіз мастацкага твора ў кантэксце філасофска-эстэтычных асаблівасцей нацыянальнай і сусветнай літаратур.

Гісторыя польскага прыгожага пісьменства разглядаецца ў сувязі са станаўленнем і развіццём нацыянальнага фальклору і старажытнай, у тым ліку антычнай, міфалогіі. Спецыфіка літаратурнага працэсу раскрываецца ў арганічнай сувязі з гісторыяй яе народа і ў кантэксце як сусветнай літаратуры, так і культур краін славянскага арэала, і асабліва культуры Беларусі (у дадзеным выпадку краіны, якая вывучае родасную – польскую мову і літаратуру, памятаючы, што яны маюць шмат падобных рыс, блізкасць мовы, гістарычных лёсаў, нават падабенства герояў, сюжэтаў, жанраў і ідэйна-мастацкіх асаблівасцей твораў).

Праграма па гісторыі польскай літаратуры абапіраецца на канцэптуальныя прынцыпы адукацыйна-выхаваўчых прыярытэтаў Рэспублікі Беларусь і на асноўныя палажэнні тэорыі літаратуры, распрацаваныя ў літаратуразнаўстве абедзвюх краін. У праграме таксама ўлічваюцца веды студэнтаў па сумежных вучэбных дысцыплінах.

Праграму можна выкарыстоўваць у якасці дапаможніка для асэнсавання прынцыпаў развіцця польскай літаратуры, засваення базавых раздзелаў курса і творчасці асобных аўтараў, самастойнай працы над прапанаванымі выкладчыкам тэмамі і пытаннямі.

Праграма можа паслужыць асновай для распрацоўкі спецкурсаў і спецсемінараў для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей, для стварэння планаў працы навуковых аб'яднанняў, гурткоў, факультатываў па польскай літаратуры, стаць адной з арганічных частак кампаратывістыкі і вывучэння

польска-іншанацыянальных літаратурных сувязей, пры асваенні тэорыі і практыкі перакладу.

Праграму па гісторыі польскай літаратуры можа быць выкарыстана для навуковых прац магістрантаў, аспірантаў, выкладчыкаў літаратуразнаўчых дысцыплін устаноў вышэйшай адукацыі.

**Мэта** прапанаванага курса – даць сістэматызаваныя веды пра асноўныя этапы і з'явы літаратурнага працэсу Польшчы ад часоў стварэння першых помнікаў пісьменства да сучаснасці ў кантэксце агульнага развіцця культуры, гісторыі, грамадскага жыцця польскага народа. Параўнальна-гістарычны (сінхранічны і дыяхранічны) падыход да разгляду і ацэнкі паасобных фактаў і з'яў літаратурнага працэсу ў рамках самога польскага пісьменства дапаўняецца тыпалагічнымі паралелямі з іншымі еўрапейскімі літаратурамі на ўзроўні і агульных тэндэнцый, і індывідуальна-аўтарскіх стыляў. Задачы праграмы — не толькі прапанаваць для засваення гісторыка-літаратурны матэрыял, але і акрэсліць яшчэ не даследаваныя з'явы, падказаць перспектыўныя шляхі самастойнай працы студэнтаў, раскрыць магчымасці іх прафесіянальнага ўдасканалення.

Інфармацыйны змест праграмы прадугледжвае модульнасць навучання, што робіць яе максімальна зручнай у карыстанні.

У выніку вывучэння дысцыпліны "Гісторыя літаратуры краіны вывучаемай мовы (Гісторыя польскай літаратуры)" **студэнты павінны**

**ведаць:**

асноўныя асаблівасці гісторыі, эвалюцыі польскай літаратуры, асноўныя перыяды развіцця;

ідэйна-мастацкія характарыстыкі кожнага з перыядаў развіцця;

творчую спадчыну розных эпох і значных пісьменнікаў кожнай эпохі;

**умець**:

прадставіць польскую літаратуру як сістэму;

даць уяўленне аб тыпалагічных і ўнікальных яе асаблівасцях;

вызначаць прыкметы кожнага перыяду развіцця польскай літаратуры;

ахарактарызаваць літаратурныя напрамкі, плыні, школы;

прааналізаваць творчасць вядомых пісьменнікаў, прадугледжаных праграмай, вызначыць мастацкі метад;

акрэсліць заканамернасці сувязяў і ўспрымання польскай літаратуры ў нашай краіне;

**валодаць**:

метадалогіяй аналізу літаратурнага працэсу, літаратурных напрамкаў, плыняў і мастацкіх метадаў;

пачатковым вопытам вызначэння аналагічных ці кантрастных па форме і зместу літаратурных з'яў;

навыкамі кампаратывісцка-тыпалагічнага вывучэння літаратур;

асноўнымі прыёмамі тэксталагічнага аналізу мастацкага твора.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны "Гісторыя літаратуры краіны вывучаемай мовы (Гісторыя польскай літаратуры)" прадугледжвае фарміраванне наступных кампетэнцый: авалодаць навыкамі вуснай і

пісьмовай камунікацыі; ажыццяўляць маніторынг навучальнага працэсу, дыягностыку вучэбных і выхаваўчых вынікаў; планаваць, арганізоўваць і праводзіць навукова-даследчую дзейнасць ў галіне філалогіі (тэксталогіі); прымяняць сучасную методыку рэферыравання і рэдагавання тэкстаў; карыстацца навуковай і даведачнай літаратурай на рускай, беларускай і замежных мовах; вызначаць мэты інавацый і спосабы іх дасягнення.

Формы і метады, якія ўжываюцца ў адукацыйным працэсе:

– тэарэтыка-інфармацыйны метад;

– метад цэласнага аналізу тэкста;

– праблемнае навучанне (даследчыцкія метады, праблемны выклад матэрыялу, выяўленне мастацкай непаўторнасці тэксту літаратуры і інш.);

– камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання (дыскусія, круглы стол, даклад або паведамленне);

– гульнявыя тэхналогіі (ролявыя гульні).

У адпаведнасці з аб'ёмам, задачамі кожнага канкрэтнага курса выкладчык і студэнт маюць магчымасць выбраць з прадстаўленага шэрагу навуковых літаратуразнаўчых прац тыя, якія з'яўляюцца найбольш істотнымі, паказальнымі, важкімі для асэнсавання таго ці іншага літаратурнага факта або працэсу. Улічваючы пашырэнне сучасных сродкаў камунікацыі, прапануюцца таксама спасылкі на рэсурсы глабальнай сеткі Інтэрнэта. Аднак аўтары-складальнікі скіроўваюць увагу на наступны момант: для філолага асноўным аб'ектам даследавання з'яўляецца кніга – тэкст літаратурнага твора, што абумоўлівае галоўную задачу: прывіваць любоў да кнігі як крыніцы ведаў, нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей. Філолаг, і асабліва настаўнік і выкладчык, павінен навучыць студэнта любіць кнігу, адчуваць подых вечна жывой прыгажосці і дабра, якія нясе мастацкая літаратура.

Праграма створана з улікам найноўшых дасягненняў у польскім і айчынным літаратуразнаўстве, распрацовак па методыцы выкладання літаратуры.

Агульная колькасць гадзін, якая даецца на вывучэнне дысцыпліны "Гісторыя літаратуры краіны вывучаемай мовы (Гісторыя польскай літаратуры)" згодна з адукацыйным стандартам, складае 472 гадзіны. Агульная колькасць аўдыторных гадзін – 316. Прыкладнае размеркаванне гадзін па відах заняткаў: лекцый – 202 гадзіны, практычных заняткаў – 114 гадзін.

# II. ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п/п | Тэмы заняткаў | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | усяго | лекцый | практычных заняткаў |
| **1.** | **Старажытная польская літаратура** | **40** | **26** | **14** |
| 1.1 | Польская літаратура Сярэднявечча | 6 | 4 | 2 |
| 1.2 | Польская літаратура Адраджэння | 12 | 8 | 4 |
| 1.3 | Польская літаратура Барока | 10 | 6 | 4 |
| 1.4 | Польская літаратура Асветніцтва | 12 | 8 | 4 |
| **2.** | **Польская літаратура эпохі Рамантызму** | **40** | **24** | **16** |
| 2.1 | Нацыянальна-гістарычная адметнасць польскага Рамантызму | 6 | 4 | 2 |
| 2.2 | Жыццё і творчасць Адама Міцкевіча | 10 | 6 | 4 |
| 2.3 | Творчая індывідуальнасць Юльюша Славацкага | 8 | 4 | 4 |
| 2.4 | Ідэйна-мастацкая і жанрава-стылёвая разнастайнасць польскай літаратуры Рамантызму | 16 | 10 | 6 |
| **3.** | **Польская літаратура пазітывізму і рэалізму** | **46** | **30** | **16** |
| 3.1 | Пазітывізм у польскай літаратуры: вытокі, спецыфіка, праграма | 6 | 4 | 2 |
| 3.2 | Развіццё прозы: творчыя індывідуальнасці і асноўныя мастацкія тэндэнцыі | 28 | 20 | 8 |
| 3.3 | Паэзія: прадстаўнікі і мастацкія тэндэнцыі | 8 | 4 | 4 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 3.4 | Польская драматургія перыяду пазітывізму і рэалізму: нацыянальнае і ўніверсальнае | 4 | 2 | 2 |
| **4.** | **Літаратура “Маладой Польшчы”** | **40** | **26** | **14** |
| 4.1 | “Маладая Польшча”: вытокі, спецыфіка, праграмы і маніфесты | 6 | 6 | - |
| 4.2 | Паэзія “Маладой Польшчы”: асноўныя тэндэнцыі і прадстаўнікі | 14 | 8 | 6 |
| 4.3 | Драматургія і тэатр “Маладой Польшчы” | 10 | 6 | 4 |
| 4.4 | Проза “Маладой Польшчы”: традыцыя і наватарства | 10 | 6 | 4 |
| **5.** | **Польская літаратура міжваеннага дваццацігоддзя (1918-1939)** | **52** | **36** | **16** |
| 5.1 | Асаблівасці развіцця польскай літаратуры ў 1920-я гг. XX ст. | 16 | 10 | 6 |
| 5.2 | Асаблівасці развіцця польскай літаратуры ў 1930-я гг. XX ст. | 14 | 10 | 4 |
| 5.3 | Польская драматургія 1920-30-х гг.: традыцыя і наватарства | 10 | 8 | 2 |
| 5.4 | Літаратурная крытыка і публіцыстыка 1920-30-х гг. XX ст. | 6 | 4 | 2 |
| 5.5 | Польская літаратура перыяду Другой сусветнай вайны і акупацыі | 6 | 4 | 2 |
| **6** | **Польская літаратура пасля Другой сусветнай вайны – пачатку XXI ст.** | **48** | **34** | **14** |
| 6.1 | Польская літаратура 1945-1955 гг.: мастацкія тэндэнцыі і | 8 | 6 | 2 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | прадстаўнікі | | | |
| 6.2 | Польская літаратура 1956-1976 гг.: мастацкія тэндэнцыі і прадстаўнікі | 12 | 8 | 4 |
| 6.3 | Польская літаратура 1976-1989 гг.: мастацкія тэндэнцыі і прадстаўнікі | 12 | 8 | 4 |
| 6.4 | Польская літаратура пасля 1990-х гг.: мастацкія тэндэнцыі і прадстаўнікі | 8 | 6 | 2 |
| 6.5 | Польская літаратура канца XX-пач. XXI ст.: мастацкія тэндэнцыі і прадстаўнікі | 8 | 6 | 2 |
| 7 | **Беларуская праблематыка ў польскай літаратуры** | **50** | **26** | **24** |
| 7.1 | Беларуска-польскія літаратурныя сувязі ў X-XVIII стст. | 6 | 4 | 2 |
| 7.2 | Беларускі кампанент у польскай літаратуры XIX ст. | 12 | 4 | 8 |
| 7.3 | Беларусь і беларусы ў культурнай прасторы Польшчы к.XIX-пач. XXI ст. | 10 | 6 | 4 |
| 7.4 | Беларуска-польскія літаратурныя сувязі ў 20-30-я гг. XX ст. | 12 | 6 | 6 |
| 7.5 | Беларускі дыскурс у польскай літаратуры другой паловы XX-пачатку XXI ст. | 10 | 6 | 4 |
| | **Усяго:** | **316** | **202** | **114** |

# III. ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## 1. Старажытная польская літаратура

### 1.1. Польская літаратура Сярэднявечча

Сярэднявечча ў Еўропе. Характар і асноўныя кірункі культуры эпохі Сярэднявечча. Біблія як найважнейшая крыніца еўрапейскай культуры. Класічная лацінская мова і станаўленне славянскіх моў. Перыядызацыя польскай літаратуры.

Польскія землі ў дахрысціянскую эпоху. Паходжанне і прагісторыя славян. Польскія плямёны, іх культура да X стагоддзя. Хрышчэнне Польшчы ў перыяд праўлення Мешкі І. Сувязь польскай культуры з Рымам (праз Чэхію і Германію) і Візантыйскай імперыяй (праз паўднёва-усходнія землі). Станаўленне і росквіт польскай дзяржавы.

Значэнне латыні ў жыцці каталіцкай царквы, дзяржавы і развіццё польскай культуры і літаратуры. Першыя дакументы, якія датычаць Польшчы (“Dagome iudex” (лац.)). Падзел славянства на лацінскае (*Slavia latina*) і ўсходняе (*Slavia orthodoxa*). “Рочнікі” (штогоднікі) як першыя пісьмовыя тэксты, іх генезіс. Найбольш старажытныя польскія “рочнікі”. Роля рэлігійных ордэнаў у сярэднявечнай Польшчы. Культ святых: Святы Войцэх (Адальберт Пражскі) і Святы Станіслаў. Сярэднявечная агіяграфія: герой, мова, свет каштоўнасцяў, спасылкі на антычную культуру. Бруна Кверфецкі як агіёграф.

Жанр хронікі ў Польшчы: Гал Ананім “Польская хроніка”: генезіс, мова, тэматыка, яе значэнне для польскай культурнай самабытнасці; Вінцэнцій Кадлубэк “Польская хроніка”: ідэйна-мастацкая і жанравая адметнасць; Янка з Чарнкова “Хроніка”; Ян Длугаш “Гісторыя Польшчы”: легендарнае і праўдзівае аб гісторыі Польскага Каралеўства. Літаратура каталіцкай царквы: а) жанры лацінскай паэзіі (гімн, песня, псалом і інш.); б) казанне, яго форма, стыль, рыторыка; в) станаўленне літургічнай драмы, містэрыі, міракля, маралітэ; г) сярэднявечныя малітоўнікі (“Малітоўнік Гертруды” і інш.); д) ужытковая лацінская літаратура (лісты, пасланні, календары); е) трактат як форма літаратурнага выражэння навуковага зместу эпохі. Значэнне лацінскіх традыцый у польскай культуры.

Першыя творы на польскай мове: “Генрыхава кніга”. “Багародзіца” і генезіс гімна як жанру, яго ідэйна-мастацкая адметнасць, гісторыка-культурнае значэнне; *deesis* і іканаграфічныя матывы, адлюстраванне вобразаў Хрыста Пантакратара, Багародзіцы і Іаана Хрысціцеля. “Свентакшыскія казанні”, “Гнезненскія казанні”: паходжанне помнікаў, іх мова і змест. Польская рэлігійная лірыка, значэнне “Свентакшыскага

ляманту”. Пасыйныя і вялікодныя песні, калядкі. Уладыслаў з Гельнёва – першы славянскі паэт і яго пасыйная песня “Ісуса Іуда прадаў за дробны грош”.

Пераклад *Бібліі* на польскую мову: “Фларыянскі псалтыр”, “Пулаўскі псалтыр”, “Біблія каралевы Зоф’і” – мова помнікаў і рэлігійны свет уяўленняў эпохі Сярэднявечча. Жанр апокрыфа.

*Dance Macabre* – літаратурнае ўвасабленне матыву танца смерці: “Размова Магістра са смерцю”. *Cizjojanusy* – ужытковыя формы сярэднявечнага пісьменства, вершаваныя календары. Усведамленне ўплыву часу і веды пра гісторыю Сярэднявечча. Свецкая лірыка: палітычная (“Песня аб забойстве Анджэя Тэнчынскага”), побытавая (“Аб паводзінах за сталом”). Генезіс і развіццё містэрыі як жанру: “Гісторыя аб хвалебным уваскрэшанні” Мікалая з Вількавецка.

## 1.2. Польская літаратура Адраджэння

Праблема перыядызацыі, значэнне тэрмінаў *“рэнесанс”* (адраджэнне) і *Humanitas* (гуманізм). Новая канцэпцыя чалавека і свету: ад сярэднявечнага тэацэнтрызму да антрапацэнтрызму эпохі Адраджэння; значэнне адкрыццяў Каперніка і Галілея. Ягелонская дзяржава як аснова развіцця культуры Адраджэння ў Польшчы. Рэлігійныя, філасофскія і эстэтычныя асновы эпохі (неаплатанізм, рэфармацыя, класіцызм). Вынаходніцтва друку і яго роля ў распаўсюджванні новых ідэй. Езуіты ў Польшчы. Функцыянаванне латыні і польскай мовы ў XVI стагоддзі. Нараджэнне і развіццё шляхецкага міфа і міфаў аб Сарматыі і сарматах.

Польска-лацінская літаратура. Паэзія на польскай і лацінскай мовах: гуманістычны пафас элегій Клеменса Яніцкага; значэнне творчасці Піліпа Калімаха, Паўла з Кросна, Мікалая Гусоўскага. Проза ў XVI стагоддзі: творчасць Аляксандра Гваньіні і інш.

Генезіс заходнееўрапейскага рамана і яго ўплыў на развіццё польскай літаратуры эпохі Рэнесансу (“Гісторыя Аляксандра Вялікага, караля Македоніі, аб баях”; “Прыгожая Мелюзіна. Цудоўная гісторыя пра марскую панну і яе мужнае патомства”). Рэнесансная гістарыяграфія: Мацей Мяхоўскі “Хроніка палякаў”; Марцін Бельскі “Хроніка ўсяго свету”; Марцін Кромэр “Аб паходжанні і дзеях палякаў”; Мацей Стрыйкоўскі “Хроніка Польская, Літоўская, Жамойцкая і ўсёй Русі”; нараджэнне сармацкага міфа ў гісторыяграфіі. Літаратура рэлігійных палемік: Сымон Будны – пісьменнік-арыянін, які належыў да польскай і беларускай культур: “Вызнанне аб урадзе і ўрадоўцах”. Анджэй Фрыч Маджэўскі і яго праца “Аб паправе Рэчы Паспалітай”. “Сеймавыя казанні” Пятра Скаргі: рэлігійны і палітычны змест твора, мова, рыторычнасць. Значэнне П.Скаргі ў польскай культуры. Пастыляграфія, яе нараджэнне ў эпоху Рэфармацыі. Польскія пастылі: каталіцкі (“Пастыль, г.зн. кароткае і простае выкладанне евангелляў, якія говораць ў хрысціянскай царкве” Якуба Вуйка); евангельскі (“Хрысціянскі пастыль” Самуіла Дамброўскага); каталіцкі (“Пастыль, або ўрокі Нядзельных Евангелляў і Урачыстых святаў” Гжэгажа з Жарноўца).

Мікалай Рэй – стваральнік польскай нацыянальнай літаратуры, рэфарматар грамадска-культурнага жыцця: "Кароткая спрэчка паміж трымя асобамі: панам, войтам і плебанам"; узор польскага двараніна, яго грамадзянскі абавязак і абавязкі перад Богам у "Сапраўдным адлюстраванні жыцця годнага чалавека". "Фіглікі" М.Рэя: жанравая і ідэйна-мастацкая адметнасць твораў.

Ян Каханоўскі і яго роля ў развіцці польскай нацыянальнай літаратуры. Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка, антычныя і хрысціянскія традыцыі ў светапоглядзе і творчасці Яна Каханоўскага."Фрашкі": жанрава-тэматычная і ідэйна-мастацкая адметнасць."Песні" Яна Каханоўскага: сувязь з традыцыяй, рэнесансная канцэпцыя чалавека, космасу і Бога, асноўныя матывы і вобразы. "Адмова грэцкім паслам": старажытная тэматыка і польская рэчаіснасць XVI стагоддзя ў драме. Міфалагічны змест, сістэма вобразаў у п'есе. "Трэны": біяграфічная аснова, жанравая і праблемна-тэматычная адметнасць. Дзіця як літаратурны герой. Значэнне творчасці Яна Каханоўскага ў развіцці польскай і еўрапейскіх літаратур.

Жанр сялянкі ў польскай літаратуры XVI- XVII стст.: "Святаянская песня пра сабутку" Яна Каханоўскага і "Сялянкі" Шымана Шымановіча.

Развіццё драмы ў XVI ст.: асноўныя тэндэнцыі і прадстаўнікі. Школьныя і езуіцкія тэатры. Інтэрлюдыя і інтэрмедыя. Плябейская савізджальская літаратура, вершы і драмы. Ян з Кіян: "Новы Савізжал або дакладней Навызжал".

### 1.3. Польская літаратура Барока

Адметнасць грамадска-палітычнага ладу Рэчы Паспалітай у XVII ст. Культура ва ўмовах наступу каталіцызму. Контррэфармацыя як еўрапейскі і нацыянальны польскі феномен. Цэнзура касцёла і "Індэкс забароненных кніг" (Index librorum prohibitorum). Фарміраванне творчасці ў рукапісах – нараджэнне сыльваў (лац. silva rerum – лес рэчаў): рукапісных збораў тэкстаў розных тыпаў (літаратурныя тэксты, каляндары, запісы інфармацыі са сваёй краіны і свету).

Развіццё сарматызму як ладу жыцця шляхты, тыпу нацыянальнай культуры, дзяржаўнай ідэалогіі і літаратурнага накірунку. Уплыў культуры Рэчы Паспалітай XVII стагоддзя на культуры суседніх краін і ўплыў іх культур (украінскай, беларускай, рускай, нямецкай, шведскай, венгерскай, турэцкай і інш.) на польскую культуру.

Эпоха і стыль барока ў польскай культуры. Праблемы перыядызацыі культуры, яе асноўныя прадстаўнікі. Тэматычная і жанравая разнастайнасць літаратуры XVII ст. Традыцыі Адраджэння ў прыгожым пісьменстве Польшчы. З'яўленне новага стылю – барока. Тэарэтычнае абгрунтаванне новага напрамку ў трактаце на лацінскай мове Мацея Сарбеўскага "Аб дасканалай паэзіі" .

Мікалай Сэмп-Шажынскі – паэт пераходнага перыяду. Тэматыка, асноўныя матывы і праблематыка вершаў. Барочнае паэтычнае мастацтва Сэмпа: змест і форма санета, паэтычныя сродкі, мова.

Барока як стыль у польскай паэзіі XVIIст., яго адметныя рысы. Бачанне свету ў дысанансах і кантрастах. Барочныя канцэпты, ідэйна-зместавае і фармальна-паэтычнае майстэрства Даніэля Набароўскага. Элементы барока ў творчасці Самуэля Твардоўскага. Ян Анджэй Морштын – выдатны прадстаўнік польскага барока: светапогляд паэта, уплыў еўрапейскай літаратуры на яго паэзію, матывы і вобразы, канцэпт кахання, адметнасць стылю, "санетатворчасць", віртуознасць формы, барочная эстэтыка ў вершах. Жанр эмблемы ў творчасці Збігнева Морштына.

Сатырычная скіраванасць паэзіі Лукаша Апалінскага, Кшыштафа Апалінскага і Максіміліяна Фрэдры. Сармацкае барока, генезіс, асноўныя ідэалагічныя пастулаты. Сарматызм і літаратура. Працяг традыцый Рэя і Кахаsuccesoўскага, сармацкі сегмент ў творчасці Вацлава Патоцкага. Ідэйна-мастацкая адметнасць яго фрашак і эпічнай паэмы "Хоцімская вайна".

Мемуарная літаратура перыяду барока. Ян Хрызастом Пасэк і яго "Успаміны" як каштоўны помнік побыту і культуры Польшчы і Беларусі XVII ст. Апавядальнік у творы, адметнасць стылю, майстэрства жывапісання. Міцкевіч аб мове твора Пасэка. Уплыў Пасэка на польскую літаратуру XIX і XX стагоддзяў (Міцкевіч, Крашэўскі, Сянкевіч).

## 1.4. Польская літаратура Асветніцтва

Сацыяльна-палітычная і культурная сітуацыя ў Рэчы Паспалітай у перыяд Асветніцтва. Традыцыі Барока ў літаратуры Асветніцтва: змена парадыгм, вытокі і папярэднікі. Нацыянальна-гістарычная адметнасць Асветніцтва ў Польшчы. Праблемы перыядызацыі.

Выбранне на каралеўскі трон Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Барацьба паплечнікаў караля за палітычныя рэформы ў дзяржаве і рэформы ў галіне культуры і асветы. "Станіславаўскі класіцызм" як напрамак у польскай культуры XVIII стагоддзя. Першыя польскія перыядычныя выданні (часопіс "Манітор") і іх культурна-асветніцкая роля. Станаўленне польскай літаратурнай мовы і барацьба за яе чысціню. Адкрыццё першага публічнага тэатра. Развіццё свецкай адукацыі.

Класіцызм як напрамак у польскай літаратуры XVIII ст. Тэорыя класіцызму ў "Мастацтве вершаскладання" Ф.К. Дмахоўскага. Ракако і сентыменталізм ў польскай літаратуры эпохі Асветніцтва, іх нацыянальная адаптацыя.

Францішак Багамолец – камедыёграф і рэдактар часопіса "Манітор". Праблематыка і героі яго п'ес, Багамолец – майстар камічных сітуацый. Уплыў Мальера на яго творчасць.

Ігнацы Красіцкі – буйнейшы прадстаўнік польскага Асветніцтва. Героікамічная паэма "Мышаіда": мастацкія прыёмы гумару і сатыры. Жанравы сінкрэтызм рамана Красіцкага "Прыгоды Мікалая Дасвядчынскага": асоба галоўнага героя, утопія і рэальнасць у творы. Паэмы "Манахамахія", "Антыманахамахія" і іх жанравая адметнасць. "Сатыры" І. Красіцкага ў люстэрку грамадска-культурнага жыцця XVIII ст. Тэматыка, жанравыя і кампазіцыйныя асаблівасці зб."Байкі і прыпавесці", "Новыя

байкі". Мастацкія асаблівасці рамана "Пан Падстолій". Значэнне творчасці І.Красіцкага ў развіцці польскай літаратуры.

Station Станіслаў Трэмбэцкі і яго паэтычнае майстэрства. Вальнадумны характар яго паэзіі. Байка як жанр у творчасці Трэмбэцкага. Культ прыроды і красы ў яго паэзіі. Міцкевіч аб паэтычнай мове С. Трэмбэцкага.

Адам Нарушэвіч – паэт і гісторыёграф. Яго мастацкая праграма. "Сатыры" Нарушэвіча і праблема іх мастацкай арыгінальнасці. Жанравае і тэматычнае багацце паэтычнай спадчыны А.Нарушэвіча (зб."Лірыкі"). Нарушэвіч як аўтар першай фундаментальнай працы 7-томнай "Гісторыі Польшчы".

Сентыментальная лірыка Ф.Карпінскага: ("Да Юстыны. Вясновая туга"); каляды, рэлігійная паэзія ("Бог нараджаецца з боскіх песняў"), арыгінальнасць формы і мастацкае наватарства. Мемуарны жанр у творчасці Карпінскага: "Гісторыя майго веку і людзей, з якімі я жыў". Францішак Дыянізый Князьнін і яго "Эротыкі": жанравая навізна і мастацкія асаблівасці. Эпічныя паэмы Каэтана Козьмяна: "Польскія памешчыкі" і "Стэфан Чарнецкі", асаблівасці эпічнай традыцыі і сацыяльная абумоўленасць характараў. Успаміны Козьмяна як эмацыяльна-праблемны дакумент эпохі.

Мастацкая адметнасць рамана Яна Патоцкага "Рукапіс, знойдзены ў Сарагосе".

Значэнне перыяду Асветніцтва ў развіцці польскай літаратуры. Жанравае багацце, удасканаленне польскай літаратурнай мовы. Традыцыі польскага Асветніцтва ў беларускай літаратуры.

## 2. Польская літаратура эпохі Рамантызму

### 2.1. Нацыянальна-гістарычная адметнасць польскага Рамантызму

Асаблівасці эпохі: Вялікая французская рэвалюцыя (1789-1794), напалеонаўскія войны і іх ўплыў на развіццё еўрапейскай культуры. Філасофскія асновы рамантызму. Канцэпцыя асобы і свету. Новы тып героя. Галоўныя праблемы і эстэтычныя катэгорыі рамантызму.

Асаблівасці гістарычнага і культурнага развіцця Польшчы (канец XVIII ст. – першая палова XIX ст.). Падзелы Рэчы Паспалітай і ўплыў гэтай трагедыі на свядомасць палякаў і творчую свядомасць пісьменнікаў. Развіццё культуры ва ўмовах няволі. Ля вытокаў польскага рамантызму: эстэтычныя ідэалы, перадрамантычныя тэндэнцыі, сінтэз асветніцкіх традыцый і рамантычнае наватарства (Ю.П.Вароніч "Гімн да Бога", А.Фаленскі "Барбара Радзівіл", Ю.У.Нямцэвіч "Гістарычныя песні", Я.Патоцкі "Рукапіс, знойдзены ў Сарагосе" і інш.)

Літаратурная палеміка. Барацьба рамантыкаў з класіцыстамі. А.Міцкевіч аб рамантычнай паэзіі. Польскі рамантызм як увасабленне вольнадумных ідэй у нацыянальна-вызваленчым руху. Перыядызацыя польскага рамантызму. Лістападаўскае паўстанне (1830) і яго адлюстраванне ў літаратуры. Польская літаратура на радзіме і ў эміграцыі. Мастацкія асаблівасці польскага рамантызму: народнасць, індывідуалізм, рамантычны гістарызм.

## 2.2. Жыццё і творчасць Адама Міцкевіча

Адам Міцкевіч – сусветна вядомы паэт, заснавальнік польскага рамантызму. Эвалюцыя творчасці. Роля фальклору ў творчасці А.Міцкевіча. Ідэйныя асаблівасці і мастацкія сродкі ранняй творчасці (“Да Іахіма Лялевеля”, “Песня філарэтаў”, “Ода да маладосці” і інш.).

Зборнік “Балады і рамансы” – маніфест ранняга польскага рамантызму. Рамантычнае асэнсаванне беларускага фальклору і народных традыцый.

А.Міцкевіч і Расія. Цыклы “Адэскія санеты”, “Крымскія санеты”. Верш “Сябрам-маскалям”. Рамантычная канцэпцыя свету і асобы, роля і функцыі пейзажа, мастацкія прыёмы.

Жанр ліра-эпічнай паэмы ў творчасці А.Міцкевіча (“Гражына”, “Конрад Валянрод”). Праблема гераізму і вернасці Радзіме. Канцэпцыя героя, арыгінальнсць і навізна мастацкіх сродкаў. “Народная эпапея” А.Міцкевіча “Пан Тадэвуш”: увасабленне палітычных ідэалаў паэта, праблема мінуўшчыны і сучаснасці, роля апавядальніка. Навізна ролі і функцый прыроды, лірычныя адступленні. Камічнае і трагічнае ў творы. Новая канцэпцыя героя, народнасць. Арыгінальнасць і навізна мастацкіх сродкаў. Значэнне твора ў сусветнай і польскай літаратурах.

Драматычная паэма А.Міцкевіча “Дзяды”: асаблівасці жанравай прыроды твора (жанравы сінтэз), сюжэта і кампазіцыі. Эвалюцыя героя (ад Густава да Канрада). Абрад дзядоў і яго ўвасабленне ў другой частцы паэмы. Праблема рамантычнага кахання ў чацвертай частцы “Дзядоў”. Лістападаўскае паўстанне і яго асэнсаванне ў творы. Роля і значэнне творчасці паэта. Мастацкая арыгінальнасць паэмы.

“Кнігі польскага народа і польскага пілігрымства” і іх ідэйна-мастацкая адметнасць. Адам Міцкевіч пра Літву (Беларусь) і русінскую (беларускую) мову. Лазанская лірыка А.Міцкевіча: асаблівасці лірычнага героя і псіхалагічныя функцыі прыроды (“унутраны пейзаж”).

## 2.3. Творчая індывідуальнасць Юльюша Славацкага

Ю.Славацкі, асаблівасці творчасці паэта. Дыскусія з А.Міцкевічам. Цыкл патрыятычных вершаў, напісаны ў час лістападаўскага паўстання (“Гімн”, “Ода да свабоды”, “Кулік”). Філасофска-лірычныя паэмы: “Гадзіна роздуму” – разважанне паэта над лёсам маладога пакалення палякаў, праблема рамантычных вандраванняў; “У Швейцарыі” – шэдэўр пейзажнай і любоўнай лірыкі. Паэмы, створаныя пасля вандроўкі ў Італію і іншых падарожжаў: адметнасці егіпецкага цыклу (“Пірамiды”, “Размова з пірамідамі”), “Падарожжа на Святую Зямлю з Неапаля”: цікавасць да свету лірычнага героя. Дантаўскія матывы ў паэмах (“Бацька зачумленных”, “Ангелі”). Крызіс рамантычнага індывідуалізму ў паэме “Бянёўскі”. Філасофска-містычныя матывы ў паэме “Кароль-Дух”.

Рамантычная драматургія Ю.Славацкага. Драма “Кардыян”: асаблівасці псіхалагічных прыемаў і філасофскае асэнсаванне трагічнай рэчаіснасці. Рамантычная драма “Балядына”: алегорыя і рэальнасць, фальклор і гісторыя, жаночыя вобразы, асаблівасці рамантычнай іроніі. Жанрава-мастацкія

асаблівасці. Праблема барацьбы за незалежнасць і метафізічная трактоўка гісторыі ў драмах Ю.Славацкага (“Сярэбраны сон Саламеі”, “Ксёндз Марэк”), сімвалічная прырода твораў. Паэтычны запавет Славацкага (“Мой тэстамант”).

### 2.4. Ідэйна-мастацкая і жанрава-стылёвая разнастайнасць польскай літаратуры Рамантызму

Асаблівасці паэтычнай творчасці Зыгмунда Красінскага (лірычныя вершы, паэмы “Перад світаннем” і “Псалмы будучыні”). Драмы З. Красінскага “Нябоская камедыя” і “Ірыдыён”: праблема творца, трагедыя героя, філасофскае асэнсаванне гісторыі і сучаснасці, паэтыка твораў.

Цыпрыян Каміль Норвід і яго месца ў літаратуры польскага рамантызму. Адметнасці рамантычнага светапогляду Норвіда і яго творчы маніфест (зборнік “Vade-mecum”). “Promethidion”: канцэпцыя лірычнага героя. Драма-містэрыя Норвіда “Ванда” і яе жанрава-стылёвыя асаблівасці, дыялогі, мастацкія прыёмы.

Камічна-гумарыстычнае адлюстраванне чалавека і грамадства ў творчасці Аляксандра Фрэдры. Сінтэз класіцыстычных і рамантычных традыцый і новыя рэалістычныя тэндэнцыі ў драмах (“Муж і жонка”, “Пан Явяльскі”, “Пажыццёвая рэнта” і інш.). Асаблівасці камізму: сітуацыі, мова, трактоўка характараў, канцэпцыя героя. Нацыянальны характар камедый “Дзявочыя абяцанні, або Магнетызм сэрца”, “Помста”. Вобразы шляхты ў творах А.Фрэдры.

Народныя і грамадзянскія матывы ў творчасці В.Поля, У.Анчыца, У.Сыракомлі, К.Уейскага і Т.Ленартовіча. Асаблівасці жанру гавэнды (шляхецкай і народнай) у творчасці В. Поля, У. Сыракомлі, Г.Жэвускага, Я.Ходзькі, З.Качкоўскага.

Ю.І.Крашэўскі. Творчая біяграфія. Тыпалогія і разнастайнасць творчасці. Крашэўскі – заснавальнік рэалістычнага сацыяльна-бытавога рамана ў польскай літаратуры. Традыцыі рамантызму і рэалістычныя тэндэнцыі ў творчасці, новая канцэпцыя свету і героя. Раманы аб польскай рэчаіснасці (“Хата за вёскай” і “Ульяна”, “Астап Бандарчук” і інш.); сацыяльна-бытавыя раманы (“Чарадзейны ліхтар” і інш.); гістарычныя раманы (“Графіня Козель”, “Бруль”, “Старая казка”). Рэалістычная канцэпцыя свету, героя і нацыянальнага характару. Гісторыя і сучаснасць. Функцыі прыроды, асаблівасці сюжэта і кампазіцыі. Роля сацыяльнай, побытавай і псіхалагічнай дэталі, мастацкія асаблівасці. Значэнне творчасці Ю.І.Крашэўскага ў развіцці польскай літаратуры.

## 3. Польская літаратура пазітывізму і рэалізму

### 3.1. Пазітывізм у польскай літаратуры: вытокі, спецыфіка, праграма

Сацыяльна-палітычная і культурна-гістарычная сітуацыі ў Польшчы ў другой палове XIX ст., асаблівасці развіцця польскай літаратуры Літаратурны працэс на фоне грамадска-палітычнага і эканамічнага развіцця

Польшчы ва ўмовах страты незалежнасці. Студзенскае паўстанне 1863г. як пераломны момант у польскай гісторыі і яго адлюстраванне ў літаратуры.

Пазітывізм як філасофскі накірунак, паходжанне тэрміна. Пазітывізм у польскай літаратуры: тэарэтычныя асновы, праграмы і літаратурныя маніфесты. Значэнне літаратуразнаўчых прац А.Свентахоўскага, Э.Ажэшкі, П.Хмялеўскага і інш.

Літаратурная дактрына пазітывізму: рэалістычная канцэпцыя свету і героя. Метады і накірункі (пазітывізм → рэалізм → натуралізм). Прыярытэтнае развіццё прозы. Раман як асноўны жанр польскай літаратуры ў эпоху пазітывізму і рэалізму. Грамадска-асветніцкая і выхаваўчая роля літаратуры. Віды, жанры, праблематыка, паэтыка і мастацкія асаблівасці літаратуры.

Крытыка і публіцыстыка ў эпоху пазітывізму. Праблематыка і жанры. Дакументальнасць і мастацкія асаблівасці. Роля хронікі (Б.Прус) і фельетона (Г.Сянкевіч). Нарыс і замалёўка (А.Свентахоўскі, П.Хмялёўскі, Э.Ажэшка). Літаратурна-крытычныя артыкулы Э.Ажэшкі. Ідэйна-мастацкія дыскусіі і спрэчкі ў перыядычнай прэсе (“Czas”, “Przegląd Polski”, “Kraj”, “Ateneum”, “Kurier Warszawski”). Уплыў журналістыкі на творчасць польскіх пісьменнікаў.

## 3.2. Развіццё прозы: творчыя індывідуальнасці

## і асноўныя мастацкія тэндэнцыі

Раман і навела ў польскай літаратуры. Рэалістычнае светабачанне і новыя героі. Дэмакратызм, народнасць, традыцыі рамантызму ў літаратуры эпохі пазітывізму, утылітарызм. “Малы чалавек” як герой літаратуры. Адлюстраванне трагедыі жыцця дзіцяці. Шляхта і арыстакратыя. Драма бяспраўнага становішча жанчыны ў грамадстве. Тэндэнцыйнасць як новая рыса прозы.

Роля і значэнне творчасці Э.Ажэшкі ў развіцці польскай літаратуры. Праблемна-эстэтычная эвалюцыя творчасці пісьменніцы. Паўстанне 1863г. і яго значэнне ў жыцці і творчасці пісьменніцы. Літаратурны дэбют Э. Ажэшкі: навела-нарыс “Малюнак з галодных гадоў”, збор апавяданняў “З розных сфер”, раман “Марта”. Беларуская праблематыка ў творчасці Э.Ажэшкі. Ідэйна-мастацкая адметнасць своеасаблівай «трылогіі» (“Нізіны”, “Дзюрдзі”, “Хам”). Герой трылогіі – “малы чалавек”, прадстаўнік беларускага народа. Эпічны характар аповяду і псіхалагічнае майстэрства ў абмалёўцы характараў. Асаблівасці паказу жыцця габрэяў у рамане “Мэйр Эзафовіч”. Псіхалагізм, сацыяльная абумоўленасць, нацыянальная адметнасць у абмалёўцы характараў. Значэнне і роля наратара. Вобраз шляхты ў творах Э.Ажэшкі (“Пан Граба”, “Пампалінскія”, “Сям’я Брохвічаў”).

“Над Нёманам” – вяршыня творчасці Ажэшкі: жанравая спецыфіка твора, асаблівасці кампазіцыі, студзенскае паўстанне і ўвасабленне ў творы ідэалаў і ідэй пазітывізму. Традыцыі рамантызму і рэалістычныя тэндэнцыі, сацыяльная абумоўленасць і псіхалагічная глыбіня ў абмалёўцы вобразаў

шляхты, арыстакратыі і сялянства. Вызначэнне маральнай годнасці чалавека ў сувязі з яго адносінамі да традыцый паўстання 1863г. Наватарства пейзажных замалёвак і паэтызацыя сялянскай працы. Легенда пра Яна і Цэцылію і яе месца ў структуры рамана. Праблема гісторыі і сучаснасці (магілы Яна і Цыцыліі, удзельнікаў паўстання 1863 і іх алегарычна-сімвалічнае значэнне). Стыль і мова рамана.

Проза Э.Ажэшкі пасля 1890 г.: пошук новых мастацкіх форм (зборнік апавяданняў "Меланхолікі», раманы "Два полюсы", «Арганаўты»). "Gloria victis" як духоўны запавет пісьменніцы. Праблемнае, ідэйна-мастацкае наватарства навел зборніка. Асаблівасці аповяду. Роля сімвалаў і алегорыі ў творы. Адухаўленне прыроды. Э.Ажэшка ў эстэтычнай свядомасці беларускага народа, пераклады твораў пісьменніцы на беларускую мову.

Б. Прус у святле праблемна-мастацкай эвалюцыі. Наватарства Б. Пруса як навеліста. Увага пісьменніка да сучаснай тэматыкі. Свет вачыма дзіцяці ў творы "Анэлька". Тэма вёскі ў рамане "Пляцоўка". "Лялька" Б. Пруса як эстэтычная мадэль рэалістычнага рамана, наватарства кампазіцыі твора, псіхалагізм і сацыяльная абумоўленасць характараў, крызіс ідэалаў "апошніх рамантыкаў" на фоне агульнага разладу ў грамадстве, канцэпцыя аўтара, апавядальніка і героя. Навізна погляду на паўстанне 1863г. Сацыяльна-палітычны вобраз эпохі ў творы.

"Фараон" – першы "палітычны раман" у сусветнай літаратуры. Наватарства і асаблівасці ў паказе гісторыі (мастацкі прыём "гістарычнага касцюма"). Праблема ўлады і народа ў святле сацыяльна-палітычнай эвалюцыі. Мастацкія традыцыі Пруса ў літаратуры XIX-XX стст.

Генрык Сянкевіч – першы лаўрэат Нобелеўскай прэміі ў польскай літаратуры. Творчасць Сянкевіча ў святле гісторыі і сучаснасці XIX-XX стст. Асэнсаванне ўласнай творчасці ў рэчышчы прынцыпу ўзмацнення маральнага духу народа ў барацьбе за незалежнасць дзяржавы. Навелістыка Г. Сянкевіча: праблематыка і жанрава-мастацкія асаблівасці, прыёмы сатыры і гратэска, крытычны погляд на сучаснасць. Вобразы бюракратаў і праблема "малога чалавека" ("Эскізы вугалем", "Бартак-пераможца", "Стары слуга" і інш.).

Гістарычны раман у творчасці Г.Сянкевіча. Праблематыка, асаблівасці, гістарычны факт і вымысел у трылогіі "Агнём і мячом", "Патоп", "Пан Валадыёўскі". Філасофскае асэнсаванне нараджэння і гісторыі хрысціянства ў рамане "Quo vadis", праблема ўлады і трагедыя творчай асобы ва ўмовах дыктатуры. Вобраз дыктатара Нерона. Маральна-псіхалагічныя партрэты першых хрысціян у святле барацьбы і пакут за ідэалы новай рэлігіі. Адметнасць сюжэта і кампазіцыі твора.

"Крыжакі" – раман аб нараджэнні Польшчы як дзяржавы. Роля гістарычных фактаў і мастацкага вымыслу ў рамане. Вобразы палякаў як барацьбітоў за свабоду і незалежнасць і вобразы захопнікаў-крыжакаў. Магнаты, шляхта і народ, роля і функцыі прыроды, батальныя сцэны. Уплывы гістарычных раманаў Сянкевіча на жывапіс (Сянкевіч-Матэйка). Традыцыі Сянкевіча ў развіцці гістарычнага рамана XIX-XX стст.

Раманы Г.Сянкевіча на сучасную тэматыку. Праблема ідэйнага крызісу і крызісу культуры ў рамане "Без дагмату". Праблема сям'і як ячэйкі грамадства ў рамане "Сям'я Паланецкіх": канцэпцыя героя-буржуа ("сімпатычнага аферыста"), топас сям'і, дома і бацькаўшчыны, жаночыя вобразы, майстэрства псіхалагічнага аналізу ў партрэтнай абмалёўцы герояў.

Аповесць для дзяцей і юнацтва "У пустыні і пушчы": аптымістычная канцэпцыя героя, роля прыгоды і вымыслу, займальнасць сюжэта, эстэтычныя і псіхалагічныя функцыі прыроды. Мастацкае майстэрства Сянкевіча ў абмалёўцы свету.

Эвалюцыя і жанрава-тэматычнае багацце творчасці Мар'і Канапніцкай. Навелістыка: сацыяльная і нацыянальная праблематыка, грамадска-філасофская абумоўленасць і псіхалагічная індывідуалізацыя герояў. Тэма "малога чалавека" – героя з народных нізоў. Цяжкое становішча дзяцей, драма жанчыны, беспрасветная праца і беднасць ("Чатыры навелы", "Мае знаёмыя", "На дарозе" і інш.).

## 3.3. Паэзія: прадстаўнікі і мастацкія тэндэнцыі

Паэзія Мар'і Канапніцкай у святле традыцый народнасці. Выкарыстанне фальклорнай скарбніцы і "авалодванне складам і ладам народнай песні". Канцэпцыя героя з народа ("Вольны наймiт", "Сэрца селяніна", "Перад судом" і інш.). Фальклорная вобразнасць і напеўнасць цыклаў вершаў "Вечаровыя песні", "На жалейцы", "З лугоў і палёў", "Песенкі і песні", "Па расе". Вершы М.Канапніцкай для дзяцей. Гісторыя бытавання і музычныя варыянты верша "Рота".

Цыклы паэтычных эцюдаў "Замалёўкі", "Драматычныя ўрыўкі", "Дробязі з дарожнай сумкі", "Італія". Эпічная паэма "Пан Бальцэр у Бразіліі", сацыяльная праблематыка і трагедыя працоўнай эміграцыі. Народнасць паэмы. Канцэпцыя калектыўнага героя. Інтэрнацыянальнае бачанне трагедыі працоўнага люду.

Дзіцячая літаратура М.Канапніцкай: "Пра гномаў і сіротку Марысю", "Па ягады", "Аб Янку-вандроўнічку", "Мая кніжачка".

Адам Аснык: рамантычныя традыцыі ў яго паэзіі, тэма студзенскага паўстання (паэма "Сон магіл"), ідэалы пазітывізму (вершы "Да маладых", "На новы год", "Сённяшнім ідэалістам"). Майстэрства пейзажнай лірыкі (зб. "У Татрах"). Філасофскія і інтэлектуальныя тэндэнцыі ў цыкле санетаў "Над глыбінямі".

## 3.4. Польская драматургія перыяду пазітывізму і рэалізму: нацыянальнае і ўніверсальнае

Асаблівасці развіцця драматургіі. Традыцыі заходнееўрапейскай драмы. Жанры. Рамантычна-філасофскія матывы ў драмах (Ф.Фаленскі "Танцы смерці", Л.Савінскі "На Украіне", А.Свентахоўскі "Духі"). Гістарычная драма (Ю.Шуйскі "Пан Твардоўскі", "Каралева Ядвіга", В.Рапацкі "Віт Ствош" і "Мікалай Капернік"). Сацыяльна-бытавая крытыка

сучаснага грамадства ў камедыях М.Балуцкага (“Акулы” (“Grube ryby”), “Суседзі”, “Клуб халасцякоў”).

## 4. Літаратура “Маладой Польшчы”

### 4.1. “Маладая Польшча”: вытокі, спецыфіка, праграмы і маніфесты

Гістарычная і сацыяльная сітуацыя ў 1890-1918 гг.. Праблема перыядызацыі, асаблівасці развіцця літаратуры “Маладой Польшчы”: уплыў заходнеўрапейскіх і рускай літаратур, фальклор і “людаманія”. Замежныя і польскія філасофскія вучэнні і літаратура “Маладой Польшчы”.

Дыскусіі вакол назвы эпохі. Метады, накірункі і стылі: дэкаданс, мадэрнізм, імпрэсіянізм, сімвалізм, рэалізм, экспрэсіянізм, неарамантызм, неакласіцызм, францішканізм. Паняцце “fin de siécle” (“канец стагоддзя”) у еўрапейскай і польскай культурах.

Культурна-ідэалагічныя цэнтры “Маладой Польшчы” (Кракаў, Закапанэ, Львоў, Варшава). Літаратурныя праграмы і маніфесты, дыскусіі.

### 4.2. Паэзія “Маладой Польшчы”: асноўныя тэндэнцыі і прадстаўнікі

Асаблівасці развіцця паэзіі, яе перыядызацыя. Новыя тэндэнцыі, патрыятычныя матывы, пратэст супраць недасканалай рэчаіснасці, пераадольванне “непаэтычных” традыцый пазітывізму, канцэпцыя свабоды мастака і мастацтва, творчая непаўторнасць, стварэнне новай паэтычнай мовы. Песімістычна-дэкадэнцкія матывы ў паэзіі. Матывы “хваробы веку”, містыцызм. Пошукі лекаў ад хваробы “канца стагоддзя”. Матывы Нірваны, мастацтва, кахання (Каспровіч, Пшэрва-Тэтмаер, Лянгэ, Мірыям, Міцінскі і інш.).

Лірыка гераізму, сацыяльнай і творчай актыўнасці. Тэма рэвалюцыі 1905 г. (Каспровіч, Жулаўскі, Міцінскі, Лянгэ, Выспянскі, Немаеўскі).

Новы від мастацтва ў літаратуры “Маладой Польшчы” – кабарэ (Т.Бой-Жаленскі, М.Шукевіч, А.Навачынскі, М.Кшымульска-Іваноўска (псеўд.Тэрэсіта)).

Паэзія часоў Першай сусветнай вайны: Л.Стаф, А.Лянгэ, К.Пшэрва-Тэтмаер, К.Ілаковіч і інш.

Лірыка Казімежа Пшэрвы-Тэтмаера як “голас пакалення”. Дэкадэнцкія матывы канца стагоддзя ў яго творчасці (“Не веру ў нічога”, “Канец XIX стагоддзя”, “Усё памірае ў смутку і жалобе” і інш). Пейзажная лірыка: паэтызацыя Татраў.

Творчасць Яна Каспровіча: жанравая спецыфіка, сацыяльныя матывы і апавядальны характар цыклу санетаў “З халупы”; прыёмы сімвалізму і імпрэсіянізму ў вершы “Куст дзікай ружы”; песімістычныя матывы зборніка гімнаў “Свету, які гіне”. Матывы катастрафізму, бунт супраць зла і несправядлівасці ў “Гімнах”. Уплыў фальклору і прыёмаў сімвалізму ў зборніку “Балада аб сланечніку”. Францішканскія матывы (зб. “Хвіліны”). Радасць штодзённага жыцця (зб. “Кніга ўбогіх”).

Роля традыцыі ў паэтычнай творчасці Леапольда Стафа. Філасофія віталізму і ніцшэанства. Сімвалісцкія тэндэнцыі, хрысціянскія матывы (“Сны

аб магутнасці”). Матыў і алегорыя дарогі (“Дзень душы”, “Нябесным птушкам”). Паэтызацыя штодзённасці (“Галіна, якая квітнее”, “Усмешкі часу”, “У засені мяча”). Стаф – лірык і гуманіст, сацыяльная і патрыятычная праблематыка ў яго творчасці (“Лебедзь і ліра”, “Вясёлка слез і крыві”).

### 4.3. Драматургія і тэатр "Маладой Польшчы"

Тэатр і драматургія “Маладой Польшчы”: напрамкі і тэндэнцыі, асаблівасці развіцця, сувязі з еўрапейскай драмай, тэатральныя цэнтры (Варшава, Кракаў, Львоў), прафесійныя і аматарскія тэатры, традыцыйная і эксперыментальная драматургія. Віды драмы: натуралістычная (Я.Каспровіч, У.Оркан), рэалістычная (Г.Запольская, Т.Рытнер), неарамантычная (С.Выспянскі), гістарычная (С.Выспянскі, Т.Міцінскі, А.Навачынскі, С.Жэромскі), сімвалісцкая (С.Пшыбышэўскі), экспрэсіяністычная (Т.Міцінскі, К.Іжыкоўскі). Мастацкае наватарства, роля фальклора и легенды, навізна інтэрпрэтацыі гістарычных падзей, сюжэтна-кампазіцыйная свабода, майстэрства псіхалагізму.

Творчы партрэт актрысы і драматурга Габрыэлі Запольскай. Драматургічны дэбют (“Лысы Амур”). Жанравая разнастайнасць, псіхалагічнае майстэрства (“Жабуся”), патрыятычная праблематыка (“Сібір”). Мяшчанская драма (“Маральнасць пані Дульскай”, “Іх чацвёра”) і салонная камедыя (“Скіз”) у творчай спадчыне Г.Запольскай.

Народны тэатр Люцыяна Рыдэля (“Польская батлейка”).

Станіслаў Выспянскі – драматург, мастак, паэт, рэжысёр і рэфарматар польскага тэатра. Жанравая разнастайнасць драм Выспянскага. Гісторыя і сучаснасць (“Легенда”, “Варшавянка”, “Лістападавая ноч”, “Легіён” і інш.). Праблемна-мастацкая значнасць драмы “Вяселле” (вобразы і прататыпы, прыём драматычнай іроніі і гратэска, традыцыі сімвалізму, калектыўны герой, нацыянальная ідэя, своеасаблівасць трактоўкі песень у драме, рэалістычная канцэпцыя свету і героя). Антычная традыцыя і сучаснасць у драмах (“Баляслаў Смелы”, “Ахілес”, “Акропаліс” і інш.). Драма “Вызваленне” ў святле нацыянальнай ідэі і прадбачання будучыні.

Творчы партрэт Тадэвуша Міцінскага. Праблема дабра і зла (“Барацьба душ”, “Рабінавая ноч”). Філасофска-сімвалічныя драмы (“Князь Пацёмкін”, “У цемры Залатога палаца, або Базіліса Тэафану”). Філасофска-грамадскаая містэрыя: серыя драм “Вэнэда”. Своеасаблівасць канцэпцыі свету і героя, індывідуальнасць трактоўкі гісторыі, філасофскі падтэкст, псіхалагічнае майстэрства.

Мадэрнісцкая драматургія Станіслава Пшыбышэўскага. Імпрэсіяністычныя прыемы, сваеасаблівая трактоўка псіхалогіі і падсвядомасці асобы, паказ унутраных супярэчлівасцей чалавека, прыём адкрытага сюжэта (“Госці”, “Залатое руно”, “Маці”, “Снег”, “Абяцанні”, “Векавая казка”).

Рэалістычная драма ў творчасці Стэфана Жэромскага. Драма-палеміка з рамантызмам – “Ружа”: трагедыя паражэння рэвалюцыі 1905 г.,

няздзейсненых ідэалаў. Неарамантычная трагедыя “Сулкоўскі”: роля гісторыі ў вырашэнні праблем сучаснасці, філасофска-псіхалагічная трактоўка асобы.

### 4.4. Проза “Маладой Польшчы”: традыцыя і наватарства

Праблемна-мастацкае наватарства прозы “Маладой Польшчы”, перыядызацыя, асноўныя метадалагічныя накірункі (рэалізм, натуралізм, мадэрнізм), жанравая разнастайнасць, рэалістычныя і мадэрнісцкія тэндэнцыі, увага да псіхалогіі асобы, арыгінальныя мастацкія прыёмы. Функцыянальна мастацкія адметнасці і навізна ў трыядзе “аўтар-апавядальнік-герой”.

Творчы партрэт Стэфана Жэромскага ў святле ідэйна-мастацкай эвалюцыі. Сацыяльна-псіхалагічныя тэндэнцыі, новы герой (“малы чалавек” і інтэлігенцыя ў змаганні за сацыяльныя ідэалы) і мастацкае майстэрства ў навелах і аповесцях. Канфлікты, настрой, праблемнае поле твораў. Выкарыстанне ў навелістыцы С.Жэромскага пісьменніцкіх тэхнік розных літаратурных напрамкаў. Сувязь нацыянальна-вызваленчай праблематыкі з грамадскімі пытаннямі (“Раздзяўбуць нас крукі, вароны...”, “Непахісная”, “Доктар Пётр”, “Бяздомныя людзі” і інш.). Раман “Сізіфава праца”: крытыка карумпаванай школы, праблема русіфікацыі, прыёмы сатыры пры абмалёўцы настаўнікаў, калектыўны герой – моладзь з дэфармаванай свядомасцю. Гістарычны раман “Попел”: выкарыстанне традыцый Льва Талстога ў паказе батальных сцэн, вобразы нацыянальных герояў, разбурэнне стэрэатыпу Напалеона як вызваліцеля Польшчы.

Вобраз польскага грамадства ў раманах “Гісторыя граху” і “Прыгажосць жыцця”. Патрыятычна-гістарычная тэма (“Верная рака”). Мастацкія традыцыі С.Жэромскага ў польскай літаратуры XX-XXI стст.

Раман-энцыклапедыя сялянскага жыцця Уладыслава Станіслава Рэйманта “Сяляне”. Абмалёўка сялянскага быту, працэсы грамадскага расслаення, карціны прыроды і іх мастацкія функцыі, паэтызацыя працы сялян, рэалістычная канцэпцыя свету і чалавека, псіхалагічнае майстэрства і сацыяльная абгрунтаванасць герояў рамана, натуралістычныя карціны ў паказе жыцця.

Раман аб буржуазіі і працоўных “Зямля запаветная”: праблемы завостранасці адносін паміж прадстаўнікамі розных сацыяльных груп у святле асноўнага канфлікту рамана. Грамадская абумоўленасць характараў, прыёмы індывідуалізацыі і псіхалагізму ў фарміраванні герояў, захапленне горадам, майстэрства гарадскога пейзажу.

Праблема выхавання і трагедыя дзіцяці ў творах Януша Корчака “Дзіця салону” і “Дзіця вуліцы”: псіхалагічнае майстэрства ў абмалёўцы вобразаў дзяцей з розных сфер жыцця.

Мадэрнісцкія тэндэнцыі ў раманах Вацлава Бэранта: “Парахно” (паказ жыцця творчай багемы, трактоўка героя ў святле філасофіі Ніцшэ, праблема разбуральнага ўплыву цывілізацыі на асобу, крытыка дэкадэнтства як з’явы ў мастацтве); “Жывыя камяні” (праблема традыцый мастацтва сярэднявечча і Адраджэння і іх уплыў на сучаснасць, крытыка цывілізацыі, ідэя вечнага

мастацтва і прыгожосці, прыём "гістарычнага касцюма" ў мастацтве); "Азіміна"(групавы партрэт прадстаўнікоў дэградаванай сацыяльнай вярхушкі і ўдзельнікаў рэвалюцыі, асаблівасці сацыяльнага і палітычнага канфліктаў, значэнне сімволікі ў рамане). Псіхалагічнае майстэрства В.Бэранта ў абмалёўцы герояў, канцэпцыя вечнасці прыгожага, роля сімвала і алегорыі, гісторыя і сучаснасць.

Тэма мастацтва ў рамане Караля Іжыкоўскага "Хімера" ("Pałuba") і аналітычна-псіхалагічная проза "Маладой Польшчы".

Анджэй Струг – "псіхалагічны" і рэвалюцыйны пісьменнік: агляд свету падполля і партрэт рэвалюцыянера (зборнік "Людзі падполля", раман "Заўтра", "Гісторыя адной бомбы", "Партрэт").

Уладзіслаў Оркан. Навелістыка пісьменніка: ад натуралізму да алегорыі. Свет жыхароў гор ў рамане "У Разтоках".

Жанравыя формы літаратурнай крытыкі "Маладой Польшчы": суб'ектыўнасць і эмацыйнасць. Літаратурныя дыскусіі, праграмныя маніфесты. Тадэвуш Бой-Жэленскі – крытык і рэцэнзент; "Маладая Польшча" вачамі Т.Боя-Жэленскага ("Ці ведаеш ты гэтую краіну?») . Дэкадэнт і дэкаданс ў святле крытыкі "Маладой Польшчы". "Ліквідатары" "Маладой Польшчы" (С.Бжазоўскі, К.Іжыкоўскі і інш.).

## 5. Польская літаратура міжваеннага дваццацігоддзя (1918-1939)

Асаблівасцю развіцця літаратуры 20-х – 30-х гадоў з'яўляецца яе «размяшчэнне» паміж дзвюма самымі вялікімі трагедыямі – I і II сусветнымі войнамі. Гэтыя факты аказалі прынцыповы ўплыў на жыццё і ўсяго чалавецтва, і кожнага народу, і кожнай асобы. Гістарычна-сацыяльныя працэсы і развіццё міжваеннай літаратуры. Сацыяльныя і навукова-тэхнічныя рэвалюцыі і эстэтычныя змены, іх уплывы на культуру і літаратуру. Адраджэнне польскай дзяржавы і аб'яднанне народу. Настрой агульнай радасці ў грамадстве Польшчы. Аптымістычны погляд на свет, на айчыну і на чалавека. Адбудаванне радзімы, абнаўленне лексікі польскай мовы і новая канцэпцыя асветы. Філасофскія і ідэалагічныя асновы развіцця літаратуры. Праблемы перыядызацыі: "светлыя" - 20-я і "цёмныя" - 30-я гады.

### 5.1. Асаблівасці развіцця польскай літаратуры ў 1920-я гг. XX ст.

Літаратура 20-х гадоў: філасофская і ідэалагічная асновы, аптымістычны настрой грамадства (віталізм), тэматыка, праблематыка, кірункі, віды і жанры літаратуры. Літаратурныя праграмы і паэтычныя групы. Канцэпцыя свету і асобы ў літаратуры. Развіццё паэзіі, публіцыстыкі і прозы малых апавядальных форм. Праграмы і маніфесты творчых аб'яднанняў: "Скамандр", "Авангард", "Футурызм", "Квадрыга". Эстэтычныя пошукі, праблемна-тэматычнае абнаўленне паэзіі, новая канцэпцыя свету і героя. Паэзія трох спосабаў мастацкага выражэння. Пакаленні творцаў. Роля пакалення «сувязі эпох» (Леапольд Стаф, Ян Каспровіч, Казімеж Пшэрва-Тэтмайер, Браніслӑва Астроўская). Праблемы традыцый і наватарства. Тыпалогія паэзіі 20-х гадоў.

Праблема асэнсавання “палітычнай вясны” ў паэзіі 20-х гг.: А.Сланімскі “Чорная вясна”, Ю.Тувім “Вясна”, Я.Лехань “Чырвоная паэма”.

Своеасаблівасць творчасці і значэнне групы “Скамандр” у развіцці паэзіі. Ідэйна-мастацкая эвалюцыя яе вядомых прадстаўнікоў: Я.Івашкевіча, Ю.Тувіма, А.Сланімскага, Я.Леханя, К.Вяжынскага.

Кракаўскі Авангард: творчая праграма і паэтычная практыка. Галоўныя прадстаўнікі: Я.Бжэнкоўскі, Я.Курэк, Т.Пайпер, Ю.Пшыбась.

Рэвалюцыйны кірунак у паэзіі 20-х гг. Творчасць У.Бранеўскага (“Паэзія”, “Парыжская камуна”), Бруна Ясенскага (“Песня пра голад”, “Слова пра Якуба Шэлю”). Творчы ўплыў Уладзіміра Маякоўскага на польскую рэвалюцыйную паэзію.

Асаблівасці развіцця прозы 20-х гг.: класіфікацыя, праблематыка, жанры. Праблемы Першай сусветнай вайны і яе трагічнай спадчыны ў навелістыцы і публіцыстыцы З.Налкоўскай (“Таямніцы крыві”), У.С.Рэйманта (“За лініяй фронту”), М.Ванькові ча (“Фрагмент эпапеі”). Вайна і праблема “страчанага пакалення” ў творчасці А.Струга (“Адзначэнне за адданую службу”, “Магіла невядомага салдата”). Літаратура аб Першай сусветнай вайне ў святле крытыкі традыцыі Генрыха Сянкевіча і “рэвізіі стэрэатыпаў”: З.Налкоўская “Граф Эміль”, С.Рэмбэк “Наган”. Вайна і праблема рэвалюцыі і барацьбы за незалежнасць Польшчы: А.Струг “Пакаленне Марэка Свіды”, Ю.Вітлін “Соль зямлі”, Я.Малашэўскі “Конь на ўзвышшы”.

Палітычны раман 20-х гадоў. Жанравыя рысы, традыцыі і асаблівасці развіцця. Праблема “пярэдадня палітычнай вясны” і “самой палітычнай вясны”. Крытычны кірунак палітычнага рамана. Канцэпцыя свету і героя. Праблема адбудовы краіны. “Раман Тэрэзы Генарт” З.Налкоўскай як першы палітычны раман у літаратуры 20-х гадоў. Ідэйна-жанравыя асаблівасці рамана Ю.Кадэна-Банроўскага “Генерал Барч”. Паказ жыцця Польшчы пасля атрымання незалежнасці ў рамане С.Жэромскага “Напярэдадні вясны”: асаблівасці праблематыкі і сродкаў мастацкай вобразнасці. Польская і руская крытыка аб рамане “Напярэдадні вясны”.

Майскі палітычны пераварот 1926 г. у Польшчы і эвалюцыя палітычнага рамана: Ю.Кадэн-Бандроўскі “Чорныя крылы”, З.Налкоўская “Нядобрае каханне”, А.Струг “Вялікі дзень”.

Бытавы і лірычны раман 20-х гадоў. Праблема выхавання і фармавання маладога пакаленння ў прозе З.Налкоўскай “Дом над лугамі”, Ю.Кадэна-Бандроўскага “У зацені забытай альхі”, Э.Зэгадловіча “Жыццё Мікалая Срэбрампісанага”. Праблемы культуры і мастацтва ў прозе Я.Івашкевіча (“Гілярый, сын бугалтара”, “Зянобія Пальмура”). Традыцыі і асаблівасці рамана кар'еры ў творчасці А.Струга (“Фартуна касіра Спяванкавіча”) і Т.Даленгі-Мастовіча (“Кар'ера Нікадэма Дызмы”).

Кірунак катастрафізму ў прозе 20-х гадоў. Р.Яворскі аб наступствах рэвалюцыі і вайны, свет і чалавек у рамане “Вяселле графа Аргаза”. Драматычны гратэск у рамане С.І.Віткевіча (Віткацы) “Ненасычэнне”, трагічны погляд на будучыню як вынік рэвалюцыі, дэфармацыя грамадства і

асобы. “Ненасэчынне” як раман перасцярогі. Тэорыя Віткацыя “чыстай формы”, “прынцыпа мяшка” і “забруджанасці жыццём” рамана як жанра. Палітычныя алегорыі ў авангардных раманах Б.Ясенскага “Ногі Ізольды Морган” і “Я палю Парыж”.

Цэзура 1932 года і літаратура 30-х гадоў – “цёмнага” дзесяцігоддзя. Асаблівасці палітычнага і сацыяльнага ўкладаў у Польшчы і свеце ў 30-я гады. Эканамічны і палітычны крызіс. Фашысцкая агрэсія ў Нямеччыне і падрыхтоўка да новай вайны. Песімістычныя настроі ў сусветным грамадстве. Новыя тэндэнцыі ў развіцці культуры і літаратуры: ідэйныя, праблемныя і мастацка-вобразныя змены. Папулярнасць прозы і рамана. Літаратура факту, тэндэнцыі натуралізму і фактаграфіі і група “Прадмесце”: Г.Багушэўская і Е.Карнацкі “Едуць вазы з цэглай”, “Вісла”. Праблема “малога чалавека” (“Мемуары беспрацоўных”). Бытавы раман і праблема “малога рэалізму” (П.Гаявічынская “Райская яблыня”, “Дзяўчаты з Наваліпак”).

Раман-сямейная хроніка (раман-сага): асаблівасці структуры і аповеду (М.Дамброўская “Ночы і дні”, З.Налкоўская “Нецярплівыя”). Традыцыі рамана-сямейнай хронікі ў літаратурах Заходняй Еўропы, прынцып “сямейнасці” і прыналежнасці да пэўнай сацыяльнай групы, сям'я як алегорыя сацыяльнай групы (класу), мастацкія асаблівасці рамана-сагі, псіхалагічныя прыёмы і сацыяльная абумоўленасць персанажаў.

Эвалюцыя палітычнага рамана, і праблема ўлады ў рамане Ю.Кадэна-Бандроўскага “Матэвуш Бігда”: традыцыі “палітычнага балаганнага тэатра”; мастацкія прыёмы сатыры і гратэска, асаблівасці палітычнага канфлікта, сатырычны аналіз “дарогі да ўлады” Матэвуша Бігды як галоўнага персанажу ў рамане.

### 5.2. Асаблівасці развіцця польскай літаратуры ў 1930-я гг. XXст.

Сінтэз сацыяльных і псіхалагічных рыс у межах аднаго твору ў літаратуры 30-х гг. Сацыяльна-псіхалагічны раман як новы від прозы: З.Налкоўская “Мяжа”, А.Важык “Сямейныя міфы”, З.Унілоўскі “Супольны пакой”.

“Вяртанне” гісторыі ў літаратуру 30-х гадоў і роля мастацкага прыёма “гістарычнага касцюма”: В.Бэрант “Заняпад правадыроў”, “Дыяген у кунтушу”, Я.Івашкевіч “Чырвоныя шчыты”, Т.Парніцкі “Аэцый, апошні рымлянін”; Л.Кручкоўскі “Кардыян і хам”. Праблема гісторыі і сучаснасці, эксперыменты ў катэгорыях часу і прасторы ў раманах “гістарычнага касцюма».

Псіхалагічны рэалізм у прозе 30-х гадоў і яго асаблівасці: сацыяльна-псіхалагічны партрэт-біяграфія героя, двухпланавая структура твора, рэтраспекцыя і эксперыменты ў катэгорыях часу і прасторы, асаблівасці аповеду (М.Кунцэвіч “Чужаземка”, А.Рудніцкі “Некаханая”, Я. Івашкевіч “Дзяўчаты з Вількаў”, Г.Багушэўская “Усё жыццё Сабіны”).

Інтэлектуальны дыскурс і літаратурны вымысел у рамане Віткацыя “Адзінае выйсце”. Роля філасофскага дыялогу, уплыў эсэ, канцэпцыя

катастрафізму, праблема культуры ў “свеце, які гіне”, прыём драматычнага гратэска.

Мастацкія эксперыменты ў прозе пісьменнікаў малодшага пакалення: містыфікацыя, магія колераў, словы-“ключы”; асаблівасці псіхалагічных прыёмаў у рамане М.Хараманскага “Рэўнасць і медыцына”. Праблема фармавання герояў, структура твора, новыя функцыі апавядальніка.

Праблема формы, канцэпцыя свету і героя ў рамане Вітальда Гамбровіча “Фердыдуркэ”. Пародыя і блазнерства. “Апазіцыі” Гамбровіча: традыцыя – наватарства, сталасць – несталасць, форма – хаос, узнёсласць – заніжанасць – як катэгорыі філасофская, сацыяльная, эстэтычная.

Міф і рэальнасць у прозе Бруна Шульца. Традыцыі рамана – сямейнай хронікі ў творы “Крамы з карыцаю”. “Сталенне” і эвалюцыя героя, свет правінцыі на мяжы дзвюх эпох: сацыяльнай стабільнасці і няўстойлівасці, роля ўспамінаў і рэтраспекцыя. Праблема формы і эксперыменты ў катэгорыях часу і прасторы, асаблівасці псіхалагічнага партрэту героя. Раман “Адам Грывалд” Тадэвуша Брэзы ў святле асаблівасцей мадэрнісцкай літаратуры. Форма твору і новыя функцыі апавядальніка. Сатырычны партрэт грамадства, і індывідуальныя характарыстыкі, храналагічныя «парушэнні», алегорыя і рэальнасць у рамане.

Новыя тэндэнцыі развіцця паэзіі 30-х гг., праблемна-тэматычныя і ідэалагічныя змены, песімістычнае бачанне свету, мастацкія асаблівасці.

Роля правінцыі ў развіцці паэзіі: люблінскае і віленскае аб'яднанні, філасофскія і псіхалагічныя тэндэнцыі, палітычныя ўплывы. Праблемы пакаленняў творцаў у святле традыцый і эксперыменту. Паэтычныя групы, іх маніфесты і творчыя праграмы.

Выдатныя прадстаўнікі групы «Скамандар» у 30-я гг.: “Цыганская біблія”, “Баль у оперы” Ю.Тувіма, іх мастацкае наватарства; філасофскія адносіны да свету і асобы Я.Івашкевіча (“Лета”, “Іншае жыццё”, “Кніга дня і кніга ночы”); “Акно без крат” А.Сланімскага як песімістычны дакумент эпохі; эвалюцыя творчасці К.Вежынскага (“Трагічная вольнасць”, “Курганы”).

Віленскі Авангард (“Жагары”). Творчасць Чэслава Мілаша. “Паэма ў застыглым часе”, “Тры зімы”: метафізічная канцэпцыя чалавека, калектыўны лірычны герой (“чалавек з натоўпу”), “эпічная дыстанцыя”. Акцэнты катастрафізму ў вершах Юзафа Чэховіча, пачуццё смерці і трагедыі жыцця, пастараль і небяспечнасць (“Людская мелодыя”), сюррэалістычныя традыцыі і сувязі з творчасцю Апаллінэра. Творчая мадэль Канстанты Ільдэфонса Галчынскага: пазіцыя багемнага творцы, спалучэнне лірызму і кпіны, традыцыі фальклора і народна-балаганныя матывы, сувязі з «высокім» мастацтвам, творамі польскай і сусветнай класікі; штодзённасць і фантастыка (“Канец свету”, “Баль у Саламона”, “Прароцтвы”). Эвалюцыя творчасці У.Бранеўскага, новыя формы паэзіі. Верш-прызыў (“Турбота і песня”), верш-партрэт (“Бакунін”), павучанне, эпічнасць і лірычнасць як спосабы аповеду і выказвання (“Крык адчаю”).

## 5.3. Польская драматургія 1920-30-х гг. XX ст.: традыцыя і наватарства

Драматургія міжваеннага двадцацігоддзя ў кантэксце развіцця польскай літаратуры. Тыпалогія і разнавіднасці драмы, развіццё тэатра і яго новыя тэндэнцыі, тэатральныя рэформы. Традыцыі "далёкія" (XIX стагоддзя) і "блізкія" ("Маладой Польшчы") у драматургіі міжваеннага перыяду. Драматургія "пакалення спалучэння": С.Жэромскага, гісторыя і сучаснасць у драме "Туронь", канцэпцыя свету і праблема мастацтва ("Уцякла ад мяне перапёлачка"), праблема крыўды, віны і расплаты ("Я стану бялейшым за снег"). Маральная і гістарычная праблематыка, "гістарычны" і "геаграфічны" касцюмы у драмах Г.Раствароўскага ("Нечаканасць", "Анціхрыст"). Псіхалагічная праблематыка і сацыяльная абумоўленасць характараў і ўчынкаў чалавека ў драматургіі З.Налкоўскай ("Дом жанчын", "Дзень яго вяртання"). Супярэчнасць жыцця і мары, псіхалагічная спагадлівасць, фантастыка і парадокс у драматургіі Е.Шаняўскага ("Адвакат і ружы", "Марак").

Авангардная драма С.І.Віткевіча (Віткацыя). Тэорыя "чыстай формы". Тэндэнцыі катастрафізму, дысананс, драматычны гратэск, песімістычнае бачанне будучыні, інтэрпрэтацыя Віткевічам мастацкіх традыцый польскай і сусветнай літаратуры ("На малым падворку"); неалагізмы, спосабы фармавання герояў, калектыўны герой («Шаўцы"), праблема гратэскна-сатырычнай індывідуалізацыі персанажаў ("Каракаціца, ці Гарканічны светапогляд"), міфатворчасць і містыфікацыя, сатырычныя панадчасавыя мадэлі, дэфармацыя рэчаіснасці, палітычная сатыра ("Шаўцы", "Ян, Мацей, Кароль Раззлаванец"). Віткацы ў кантэксце драматургіі XX ст. Віткацы як папярэднік еўрапейскага "тэатра абсурду". Радыкалізацыя авангарднай драмы, асаблівасці формы і гратэскна-сатырычныя ўласцівасці, фантастыка і ўмоўнасць, спецыфіка канфлікту, містыфікакцыя чытача (гледача), сюжэтныя гульні: Б.Ясенскі «Баль манекенаў»; бурлеск і балаган В.Вандурскага "Гульня аб Ірадзе", "Смерць на грушы"; псіхааналіз і гратэск у авангарднай драме В.Гамбровіча "Івона – бургундская князёўна": асаблівасць формы і мовы, роля пародыі і гратэска ў фарміраванні герояў; сатыра на традыцыйны тэатр і драматургію. Традыцыі Гамбровіча ў сусветнай драматургіі.

## 5.4. Літаратурная крытыка і публіцыстыка 1920-30-х гг. XX ст.

Літаратурная крытыка (навуковая і часопісна-папулярная). Разлік з мінулым – эпохамі няволі і Першай сусветнай вайны. Змена нацыянальнай ідэі ў літаратуры. Стваранне новай незалежнай дзяржавы і новай культуры. Творчыя аб'яднанні і групіроўкі, іх праграмы і маніфесты. Светапоглядавыя і мастацкія традыцыі Станіслава Бжазоўскага, Ігната Матушэўскага, Цэзарыя Еленты. Дыскусіі і палемікі аб ролі літаратуры ў грамадстве. Дзве канцэпцыі развіцця літаратуры: С.Жэромскага – літаратура на службе грамадству і С. Пшыбышэўскага – мастацтва для мастацтва. Дзейнасць літаратурных арганізацый: Саюз польскіх пісьменнікаў, Пэн-клуб, Акадэмія польскай літаратуры.

Важнейшыя літаратурныя часопісы і іх роля ў развіцці літаратуры і літаратуразнаўства: “Wiadomości Literackie”, “Miesięcznik Literacki”, “Pion”, “Nowa Kultura”, “Żagary”, “Ateneum”, “Robotnik”. Бачанне развіцця польскай літаратуры ў крытычных і літаратуразнаўчых даследванннях вядомых вучоных 1920-х – 30-х гг. К.Іжыкоўскі аб эстэтычных каштоўнасцях літаратуры, аб узаемнай залежнасці формы і зместу твора (“Дзеянне і слова”, “Барацьба за змест”), драма і тэатр Польшчы і Заходняй Еўропы ў рэцэнзіях і даследаваннях Т.Боя-Жэленскага (“Флірт з Мельпаменай”, “Даследаванні і нарысы французскай літаратуры”), К. Чахоўскага (“Сучасная польская літаратура”), Л.Фрыдэ аб творчасці маладога пакалення пісьменнікаў 30-х гг. (“Два пакаленні”), палемічныя працы аб праблемах формы С.І.Віткевіча (“Аб чыстай форме”, “Чаму раман не з'яўляецца творам чыстага мастацтва”).

### 5.5. Польская літаратура перыяду Другой сусветнай вайны і акупацыі

Спецыфіка літаратурнага працэсу ў перыяд Другой сусветнай вайны. Развіццё літаратуры ў краіне і ў эміграцыі. Літаратура руху супраціўлення: літаратурная дзейнасць пісьменнікаў ва ўмовах канспірацыі і барацьбы з фашызмам: школы, універсітэты, часопісы (“Пералом”, “Полымя”, “Мастацтва і народ”, “Літаратурны месячнік”, “Дарога” і інш), выдавецтвы. Багацце і жанравая разнастайнасць літаратуры. Творчасць і антыфашысцкая дзейнасць Чэслава Мілаша: асэнсаванне трагедыі Польшчы ў час фашысцкай акупацыі (“Горад”, “Рака”, “Кніжка з руін”), трагедыя і знішчэнне габрэяў (“Кампа ді Фіорі”), пакуты народу і барацьба з акупантамі ў апавяданнях Е.Анджэеўскага (“Прызыў”), А. Рудніцкага (“Верасень”, “Юзэфаў”). Я.Івашкевіча (“Старая цагельня”) і інш. Пакаленне «калумбаў», іх барацьба і творчасць: К.К.Бачынскі “Выбраныя вершы”, Т.Бароўскі “Песні” і інш.

Польская літаратура ў эміграцыі: У.Бранеўскі – аб вераснёвым паражэнні “Жаўнер”, “Дрэва, якое пакутуе”, аб барацьбе з фашызмам у іншых краінах – анталогія “Марш пакарання. Жаўнерская паэзія”, А. Важык – зборнік вершаў “Сэрца граната”, Ю.Тувім – паэма разважання “Кветкі Польшчы”, Г.Наглер “Тут знаходзіцца Польшча” і інш.

Дакументальная літаратура як сведчанне бязлітаснасці вайны і эпохі крэматорыяў “Дзённік перыяду вайны” З.Налкоўскай, “Нібы жыццё”, “Успаміны аб паражэнні” К.Выкі, “Дым над Біркенаў” С.Шмаглеўскай і інш.

## 6. Польская літаратура пасля Другой сусветнай вайны – пачатаку XXIст.

Грамадска-палітычная сістэма ў Польшчы пасля Другой сусветнай вайны – да 1989 г. Супадзенне рытму літаратурнага працэсу ў краіне з рытмам палітычнага жыцця як аснова перыядызацыі пасляваеннай польскай літаратуры. Літаратура ў краіне і ў эміграцыі. Праблема перыядызацыі. Метады і кірункі. Жанры, стылі, праблематыка літаратуры.

## 6.1. Польская літаратура 1945-1955 гг.:

## мастацкія тэндэнцыі і прадстаўнікі

Рэалістычныя тэндэнцыі ў літаратуры 1945-1948 і спосаб раскрыцця ў лёсах герояў гістарычных заканамернасцяў. Дыскусія аб развіцці літаратуры ў часопісах марксісцкай арыентацыі (“Творчасць”, “Адраджэнне”, “Кузніца”), каталіцкага “Тыгодніка паўшэхнага”. Цэнтры развіцця польскай літаратуры і перыёдыкі ў эміграцыі: “Вядамосці” (Лондан), “Культура” (Парыж).

Асэнсаванне трагічных гадоў акупацыі Польшчы гітлераўцамі. Дакументальная аснова літаратуры (зборнік апавяданняў З.Налкоўскай “Медальёны”): трагедыя акупацыі вачыма ахвяр фашызму, праблема героя і антыгероя (вязні лагероў і вобразы фашыстаў), асуджэнне канфармізму і дэмаралізуючага ўплыву фашызму, эмацыйная стрыманасць апавяданняў. Палемічная завостранасць апавяданняў Т.Бароўскага: “Развітанне з Марыяй” і “Каменны свет”. Успаміны вязняў фашысцкіх лагераў і турмаў: С. Шмаглеўская “Дым над Біркенау”, М.Русінэк “З барыкады ў даліну голаду”, К.Жывульская “Я пражыла Асвенцым” і інш. Маральная стойкасць герояў у прозе пра трагічныя будні вайны: “Нялюдскі час” С.Атвіноўскага, “Некрануты пейзаж” К.Філіповіча, “Шэкспір” А.Рудніцкага, “Хлопец з Сальпейскіх стэпаў” І.Неверлі. Тэма нечаканага нападу фашыстаў на Польшчу (1 верасня 1939 года): В.Жукроўскі “З краіны маўчання”, С.Зялінскі “Дно міскі”. Лёсы палякаў у СССР у гады вайны, пра савецкія лагеры і высылкі: Г.Херлінг-Грудзінскі “Іншы свет. Савецкія запіскі”, Б.Абертынская “З дому няволі” і інш.).

Крытычная ацэнка даваеннага жыццёвага ўкладу і пасіўнасці інтэлігенцыі ў раманах “Сцены Ерыхона” Т.Брэзы, “Вузлы жыцця” З.Налкоўскай. Аналіз псіхалагічнага тыпу перадваеннага польскага інтэлігента ў так званай «літаратуры інтэлігенцкіх разрахункаў»: К.Брандыс “Няскораны горад”, С.Дыгат “Бадэнскае возера”.

Асэнсаванне трагедыі Польшчы пасля Другой сусветнай вайны. Раман Е.Анджаеўскага “Попел і дыямант”: трагічны лёс прадстаўніка маладога пакалення ў новай Польшчы. Сімволіка рамана, псіхалагізм вобразаў, палітычная тэндэнцыйнасць.

Асаблівасці паказу вайны ў драме Л.Кручкоўскага “Немцы”: філасофскае асэнсаванне і псіхалагічная матывіроўка вобразаў, праблема выбару чалавекам свайго месца ў жыцці.

Драматычныя перажыванні народа ў гады вайны і іх адлюстраванне ў паэзіі. Афарыстычнасць і значнасць вобразаў у вершах Л.Стафа: зборнікі “Мёртвая пагода” і “Лазіна”. Адраджэнне жанру ліра-эпічнай паэмы Ю.Тувімам (“Кветкі Польшчы”), публіцыстычныя вершы, пераклады Тувіма вершаў рускіх і савецкіх аўтараў і іх значэнне. Тувім на рускай і беларускай мовах.

Сінтэз асабістага, аўтабіяграфічнага і гісторыі польскага народа ў паэзіі У.Бранеўскага: зборнікі вершаў "Надзея", "Анка", цыкл "Новыя вершы", паэмы "Мазовія", "Вісла".

Паэтызацыя штодзённасці, свежасць пачуццяў, незвычайнасць лірычных сітуацый, гумар у лірыцы К.І. Галчынскага (зборнікі "Зачараваныя дарожкі", "Заручальны пярсцёнак"); мастацтва як творчая праца паэта (паэмы "Ніабея" і "Віт Ствош"). Высмейванне забабонаў, снабізму, грамадскіх міфаў і стэрэатыпаў паводзін (кабарэ "Зялёная гусь").

Новыя тэндэнцыі ў паэзіі Т.Ружэвіча: «празаізацыя» і антыметафарычнасць верша, «апавядальны» рытм, стрыманасць тону, прастата і праўдзівасць паэтычнага слова. Асаблівасці адлюстравання тэмы вайны: паказ злачынстваў фашызму, разбурэнне традыцыйных культурных, эстэтычных, маральных каштоўнасцей (зборнікі вершаў "Трывога", "Чырвоная рукавічка", "Пяць паэм", "Час, які ідзе", "Вершы і карціны", "Раўніна"). Гістарычны песімізм і абарона гуманістычных каштоўнасцей у паэзіі Чэслава Мілаша ("Вызратаванне", "Маральны трактат").

Палітыка Польскай аб'яднанай рабочай партыі ў галіне культуры і падпарадкаванне мастацкай творчасці ідэалагічным задачам. Сацыялістычнаы рэалізм як аснова развіцця польскай літаратуры. Устаноўкі марксісцкай літаратурнай крытыкі на "сацыялагічную канструкцыю чалавечага лёсу" і "сацыялагічную тыповасць", "станоўчага героя". Крытыка ідэалагічнага ціску на культуру ў кнізе Ч.Мілаша "Скуты розум". Ідэйны маніфест перыяду сацрэалізму Е.Анджаеўскага "Партыя і творчасць пісьменніка". "Прадукцыйныя раманы" аб будаўніцтве сацыялізму ў Польшчы: А.Сцібор-Рыльскі "Вугаль"; В.Залеўскі "Трактары здабудуць вясну"; К.Брандыс "Грамадзяне" і інш.

Змена ракурсаў асэнсавання тэмы вайны: В.Жукроўскі "Дні паражэння", Е.Путрамант "Верасень", Б.Чэшка "Пакаленне", Л.Бучкоўскі "Чорны паток".

Гістарычная проза і яе асаблівасці: гісторыя шляхецкага нацыянальна-вызваленчага руху ў рамане-тэтралогіі Т.Голуя "Каралеўства без зямлі". Раманы аб стваральнай ролі касцёла: цыкл А.Голубева "Баляслаў Храбры". Раман-біяграфія: М.Яструн "Міцкевіч", "Паэт і дваранін. Аповесць пра Яна Каханоўскага"; Е.Брашкевіч "Аповесць пра Шапэна"; Я. Парандоўскі "Петрарка", "Алхімія слова".

Тэорыя бесканфліктнасці ў драматургіі (Я.Івашкевіч "Адбудова памылкамера"; Л.Кручкоўскі "Візіт").

## 6.2. Польская літаратура 1956-1976 гг.: мастацкія тэндэнцыі і прадстаўнікі

Прыкметы “адлігі” ў польскай культуры пасля смерці І.В.Сталіна: крытыка грамадска-палітычнай сістэмы і фальшу ў літаратуры (А.Важык “Паэма для дарослых”, К.Брандыс “Успаміны аб сучаснасці”, “Чырвоны капялюшык”), адлюстраванне жыцця польскай вёскі пасля Другой сусветнай вайны (М.Дамброўская “Вяселле ў вёсцы”, “Клеменс Лагойскі”).

Дэсталінізацыя сацыяльна-культурнага жыцця пасля ХХ з’езда КПСС і VIII пленума Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі (кастрычнік 1956). Крытыка метаду сацыялістычнага рэалізму і адмова пісьменнікаў ад яго прынцыпаў, лібералізацыя цэнзуры. Вяртанне пісьменнікаў з эміграцыі (М.Ваньковіч, З. Кассак-Шчуцкая, М.Хараманскі, М.Кунцэвіч), выданне іх твораў. Знаёмства польскага чытача з творчасцю пісьменнікаў, якія засталіся ў эміграцыі (раман В.Гамбровіча “Транс-Атлантык” і інш.). Публікацыя забытых і забароненых твораў: з рускай літаратуры – Бабель, Пільняк, Булгакаў, Эрэнбург, з польскай – С.І.Віткевіч, Б.Шульц, Т.Парніцкі, Б.Лесьмян, Я.Лэхань, А.Струг; узнаўленне выдання пісьменнікаў-камуністаў, якія загінулі ў СССР: Б.Ясенскі, С.Р.Стандэ, В.Вандурскі і інш. Пераклады класікаў заходніх літаратур (Хэмінгуэй, Бэкет, Фолкнер і інш.)

Барацьба ўраду ПНР з так званым “рэвізіянізмам” ў літаратуры і культуры: закрыццё перыядычных выданняў (“Папросту”); ліквідацыя штотыднёвіка “Новая культура”, ўзмацненне цэнзуры і прыпыненне публікацый многіх аўтараў. Канфлікт паміж уладай і творчай інтэлігенцыяй (забарона у сакавіку 1968 г. паэтычнай драмы А.Міцкевіча “Дзяды” ў Нацыянальным тэатры ў Варшаве).

Літаратура «разрахункаў»: асуджэнне пісьменнікамі уласных ілюзій і нарматыўнай эстэтыкі, ідэалізацыя грамадскага жыцця (К.Брандыс “Маці Круляў”, Е.Анджаеўскі “Цемра ахінае зямлю”, “Брамы раю”).

“Бязлітасны” рэалізм прозы Марэка Хласкі: майстэрства кампазіцыі, метафарычнасць і багацце мовы (“Першы крок у хмарах”, “Восьмы дзень тыдня”, “Пісьмо”, “Наступны ў рай”). Бунт прадстаўнікоў “сацыяльных нізоў” у творах Марэка Навакоўскага (“Гэты стары злодзей”, “Трамплін”, “Запіс”, “Бег” і інш.).

“Інтэлектуалізацыя” прозы: суб’ектывізацыя аповеду, уплывы эсэ, рэфлексійнасць (А.Рудніцкі “Блакітныя старонкі”, К.Брандыс “Лісты да пані Z. Успаміны пра сучаснасць”, “Як быць каханай?”, “Спосаб існавання”, “Паштовыя варыяцыі”. Т.Брэза “Бронзавая брама”, “Лабірынт”, С.Дыгат “Дыснэйлэнд”, Я.Бахенскі “Боскі Юлій. Запіскі антыквара”.

“Суб’ектыўная эпапея” Я.Івашкевіча “Слава і хвала” аб лёсах шляхецкай інтэлегенцыі ў першай палове ХХ ст. Філасофска-псіхалагічныя асаблівасці навелісткі Я.Івашкевіча (зборнікі “Аб сабаках, катах і чарцях”, “Сады” інш.).

Філасофска-этычныя змены ў літаратуры аб Другой сусветнай вайне: крытыка хлуслівага пафасу гераізму ў мікрарамане Б.Чэшкі “Трэн”; дэтэрмінацыя партызанскім мінулым лёсаў сучасных герояў у рамане Т.Канвіцкага “Сучасны соннік” – арыгінальнасць кампазіцыі і стылістыкі рамана; экспрэсіўны стыль рамана Е.Путрамента “Болдын”; аповесці і

апавяданні Е.С.Ставінскага (“Канал”), “Запіскі маладога варшавяніна ў дзень нараджэння”; жанравыя асаблівасці мікрараманаў К.Філіповіча (“Дзённік антыгероя”, “Сад спадара Нічкэ”); творы аб Варшаўскім паўстанні 1944 г.: Р.Братны “Калумбы – год нараджэння дваццаты”, М. Бялашэўскі “Дзённік варшаўскага паўстання”).

Сялянская праблематыка ў польскай літаратуры: канфлікт паміж цывілізацыяй і сялянскімі традыцыямі ў мікрараманах Ю.Кавальца “Прыпісаны да зямлі”, “Танцуючы ястраб”, “Пераплывеш раку”. Фальклорная аснова і міфалагічны свет у раманах Т.Новака “А як каралём, а як катам будзеш”, “Д’яблы”, “Дванаццаць”, “Прарок”. Гратэскна-парадыйныя тэндэнцыі ў аповесці Э.Рэдлінскага “Канаплінка”.

Праблемна-мастацкія змены ў гістарычнай прозе. Раманы “гістарычнага касцюма” Т.Парніцкага (“Аблічча месяца”, “Толькі Беатрычэ” і інш). Крызіс дэкадэнцкай культуры і светасузірання пачатку ХХ ст. у творчасці А.Кусневіча: “Кароль абедзвюх Сіцылій”, “Зоны”, “Урок мёртвай мовы”. Гістарычныя “рэпартажы” М.Брандыса (“Канец свету лёгкай кавалерыі”).

Навукова-філасофская фантастыка С.Лема: праблемы пазнавальнасці сусвету, кантакты з іншымі цывілізацыямі, канфлікт паміж чалавекам і машынай (“Зорныя дзённікі”, “Салярыс”, “Вяртанне з зорак”, “Казкі робатаў” і інш).

Інтэлектуальна-філасофскія змены ў лірыцы: узмацненне рэфлектыўнага пачатку, стаўленне да слова як да дакладнага інструменту для выказвання думкі, метафарычнасць, моўныя эксперыменты. “Маралістычная” паэзія Т.Ружэвіча (“Размова з прынцам”, “Зялёная ружа”, “Твар”, “Рэгіо” і інш.) Метафарычнасць і іранічная дыстанцыя ў філасофскай лірыцы В.Шымборскай (зборнікі “Заклік да снежанага чалавека”, “Соль”, “Умора”, “Кожны выпадак”, “Вялікія лічбы”). “Неакласічная” інтэлектуальная лірыка З.Хэрберта (“Струна святла”, “Гермес, сабака і зорка”, “Даследаванне прадмета”, “Надпіс”, “Пан Когіта”). “Лінгвістычная” паэзія М.Бялашэўскага (“Абароты рэчаў”, “Разлік жаданняў”, “Памылковыя ўзрушэнні”).

Філасофская праблематыка і матывы змены часоў і пакаленняў у паэзіі Я.Івашкевіча (зборнікі “Заўтра жніво”, “Круглы год”, “Ксеніі і элегіі”). Філасофска-экзістэнцыяльныя матывы ў паэзіі Нобелеўскага лаўрэата Ч.Мілаша (“Паэтычны трактат”, “Кароль Попель і іншыя вершы” “Горад без імя”, “Дзе сонца ўзыходзіць і куды садзіцца” і інш.).

Наватарства «парабалічных» драм С.Мрожака, сінтэз абсурдных сітуацый і рэалістычных дэталей, псіхалагічныя прыёмы, эксперыменты ў галіне прасторы і часу (“Паліцыя”, “У адкрытым моры”, “Танга”, “Эмігранты”, “Амбасадар”, “Партрэт” і інш.)

Канцэпцыя героя і свету ў асацыятыўных і шматзначных драмах Т.Ружэвіча (“Картатэка”, “Сведкі або наша малая стабілізацыя”, “Перарваны акт”, “Белы шлюб”, “Пастка”). Філасофска-паэтычныя драмы М. Бялашэўскага, І.Ірэдынскага, С.Грахавяка, З.Хэрбэрта, Э.Брыля. Узбагачэнне

рэалістычных традыцый сучаснымі сродкамі пабудовы драмы ў інтэлектуальна-філасофскіх п'есах Л.Кручкоўскага "Першы дзень свабоды" і "Смерць губернатара". Гратэскна-сатырычныя драмы "Вяселле", "Аперэтка" В.Гамбровіча ў святле канцэпцыі абсурднасці свету.

## 6.3. Польская літаратура 1976-1989 гг.: мастацкія тэндэнцыі і прадстаўнікі

Грамадска-палітычны крызіс у краіне і жорсткае падаўленне забастовак, пратэсты творчай інтэлігенцыі, стварэнне "Камітэта абароны працоўных" (1976). "Літаратура другога круга абыходжання"("drugiego obiegu"): падцэнзурныя публікацыі, выдавецтвы ("Нова" і інш.), часопісы ("Запіс", "Пуле" і інш.) Стварэнне незалежнага прафсаюза "Салідарнасць" (1980), увядзенне ў Польшчы ваеннага становішча (13.XII. 1981, адменена ў 1983 г.). Пераход улады да апазіцыйных сіл (ліпень 1989 г.).

Дасягненні і новая праблематыка ў паэзіі: мова, памяць культуры, этыка, міфатворчасць, біялогія, палітыка і рэлігія. Завяршэнне творчага шляху Я.Івашкевіча: экзістэнцыяльныя праблемы жыцця і смерці, універсальных каштоўнасцей ("Карта спакою", "Музыка ўвечары"). Макра-і мікраперспектыва філасофскага бачання свету ў творах В.Шымборскай ("Людзі на мосце"). Маральны максімалізм паэзіі З.Херберта ("Рапарт з горада ў аблозе"). Шырокі кантэкст культуры і класічная гармонія свету ў творах Ч.Мілаша, апублікаваных у Польшчы пасля 1980 г. (Гімн аб перліне", "Неабдымная зямля"). Праблема мастацтва і свету ў паэзіі Т.Ружэвіча ("Траўматычны аповяд", "На паверхні і ўнутры паэмы"). Паэты "новай хвалі" – Э.Ліпская, С.Баранчак, Ю.Корнхаузер, А.Загаеўскі і інш.

Публіцыстычнасць і палітызаванасць водгукаў на ўвядзенне ваеннага становішча (вершы В. Варашыльскага "Люстра. Дзённік інтэрнавання", Я.Палкоўскага, М.Яструна і інш.; проза М. Навакоўскага "Рапарт аб ваенным становішчы", А.Шчыпёрскага "З дзённіка ваеннага становішча" і інш.).

Аналіз псіхалагічнага стану сучаснага польскага грамадства, асэнсаванне "польскіх лёсаў" у XX ст. у прозе "другога круга абыходжання". Раманы Т.Канвіцкага "Польскі комплекс" і "Малы апакаліпсіс", Е.Анджаеўскага "Месіва", К.Брандыса "Нерэальнасць", Я.М.Рымкевіча "Польскія размовы летам 1983 г.", І.Неверлі "Пасля піру багоў".

Сінтэз праблематыкі «вясковай» прозы і універсальных каштоўнасцей у творчасці В.Мысліўскага ("Камень на камень").

Сінтэз "квазідакументальнай" і аўтабіяграфічнай прозы і выданне дзённікаў, успамінаў, эсэ польскіх пісьменнікаў мінулых эпох і эмігрантаў: В.Гамбровіча "Дзённікі. 1953-1966"; Г.Херлінга-Грудзінскага "Дзённік, напісаны ноччу" (1971-1988); Ч.Мілаша "Сямейная Еўропа" , "Зямля Ульро"; А.Вата "Маё стагоддзе"; "Дзённікі" З.Налкоўскай і М.Дамброўскай. Стратэгія гульні з чытачом і элементы постмадэрнізму ў аўтабіяграфічных кнігах Т.Канвіцкага ("Каляндар і клепсыдра", "Усходы і заходы месяца", "Памфлет на самога сябе", "Бохінь").

Раманы С.Лема аб сацыяльных і маральных наступствах тэхнакратычнай цывілізацыі, філасафічнасць фантастыкі, прыём дыскурсу ("Агляд месца здарэння", "Свет на зямлі", "Фіяска").

**6.4. Польская літаратура пасля 1990-х гг.: мастацкія тэндэнцыі і прадстаўнікі**

Пералом 1989. Ліквідацыя цэнзуры і падзелу літаратуры ў краіне і эміграцыі, афіцыйныя і неафіцыйныя выдавецтвы, змены ролі літаратуры ва ўмовах яе камерцыялізацыі і зменаў у галіне сусветнай культуры на мяжы XX і XXI стст. і развіцця тэхнічных сродкаў камунікацыі (інтэрнэт). Уваход у літаратуру пісьменнікаў малодшага пакалення («пакаленне 1960»), постмадэрнісцкая праграма часопіса "бру-Ліён" (Кракаў). Мастацкія прыёмы постмадэрнізму (змяшэнне стыляў, пародыя, інтэртэкстуальнасць, моўныя гульні, антыміметычнасць) і рэакцыя на іх мастакоў слова старэйшага пакалення.

Раман "ініцыяцыі" або "сталення": П.Хюлле "Вайзер Давідэк", А.Стасюк "Белы крумкач", В.Такарчук "Э.Э.", "Правек і іншыя часы", М.Грэткоўская "Падручнік для людзей". Асаблівасці адлюстравання "малой радзімы" ў рамане С.Хвіна "Ханеман". Гумарыстычныя і гратэскныя інтанацыі прозы Е.Пільха ("Пад моцным анёлам").

Новыя кнігі празаікаў старэйшага пакалення. Абсурднасць і хаос сучаснага жыцця ў рамане-пародыі на постмадэрнізм Т.Канвіцкага "Чытво". Ліра-эпічны раман В.Мысліўскага "Гарызонт". Этычныя праблемы апавяданняў Г.Херлінга-Грудзінскага (зборнік "Гарачае дыханне пустыні"). Іранічныя раманы Э.Рэдлінскага "Крывацёк", "Трансфармейшан, ці як рулька танчыла з гамбургерам". Дакументальны характар твораў Г.Грынберга аб генацыдзе польскіх габрэяў ("Спадчына", "Дзеці Сіёна", "Мемарбух").

**6.5. Польская літаратура канца XX-пач.XXI ст.: мастацкія тэндэнцыі і прадстаўнікі**

Змены ў паэзіі класікаў польскай літаратуры (кан. XX-пач.XXIст.), метафізічныя і этычныя праблемы, прыёмы псіхалогіі і ўплывы філасофіі: Т.Ружэвіч "Барэльеф", "Заўсёды фрагмент", "Ножык прафесара", "Шэрая зона", "Фрэскі". Чалавек і космас у філасофска-іранічнай паэзіі В.Шымборскай "Канец і пачатак", "Хвіліна". Захапленне светам і жыццём у вершах Ч.Мілаша "На беразе ракі", "Гэта", "Другая прастора".

Адмова ад сацыяльна-грамадскай праблематыкі, увага да прыватнага жыцця і інтымных перажыванняў, эксперыменты ў галіне мовы ў творчасці паэтаў малодшага пакалення: М. Святліцкі "Халодныя краіны", "Схізма", "Адкрыты надалей да адмены", "Непатрэбныя ўчынкі"; А. Сасноўскі "Сілуэты і цені", "Мовы агню", "І я пабег у гэты туман".

Гратэскныя п'есы з жыцця Расіі ў XX ст. з выкарыстаннем матываў чэхаўскіх драм: С.Мрожак "Каханне ў Крыме" і Я.Главацкі "Чацвёртая сястра". Крытыка масавай культуры, чалавек культуры на "сметніку" сучаснай цывілізацыі: Я.Главацкі "Паляванне на тараканаў", "Антыгона ў Нью-Йорку".

## 7. Беларуская праблематыка ў польскай літаратуры

### 7.1. Беларуска-польскія літаратурныя сувязі ў X-XVIII стст.

Традыцыі славянскага адзінства, падабенства лёсаў польскага і беларускага народаў у іх літаратурах. Беларусь як прастора дыялогу дзвюх культур – праваслаўна-візантыйскай і каталіцка-лацінскай. Старабеларуская рэдакцыя граматы польскага караля Уладыслава II Ягайлы князю Скіргайлу (1387). Ягелонскі ўніверсітэт (1364) – alma mater шматлікіх пакаленняў беларускай інтэлігенцыі. Выдавецтва ў Кракаве і выданне кніг на кірыліцы, пераважна рэлігійнага зместу, для праваслаўнага насельніцтва Беларусі і Украіны.

XV-XVI ст.: зараджэнне беларуска-польскіх літаратурных сувязей. Люблінская ўнія і аб'яднанне Польшчы і ВКЛ у федэратыўную краіну. Пераклады польскіх спісаў на старабеларускую мову: "Александрыя", аповесць аб Троі, Атылу, Скандэрбергу, папулярныя рыцарскія раманы аб Трыстане і Ізольдзе. Польскі і лацінскі кнігадрук на Беларусі. Пераклады Статутаў ВКЛ, беларуска-літоўскіх хронік на польскую мову. Сувязі М.Рэя і Я.Каханоўскага з беларускай культурай. Творчасць М.Гусоўскага, С.Буднага, В.Цяпінскага, А.Філіповіча. Польскамоўная паэтычная спадчына А.Рымшы – паэма "Дзесяцігадовая аповесць ваенных спраў Кшыштафа Радзівіла". Лацінамоўны "лірычны" эпас у полілінгвістычнай літаратуры Беларусі XVI-першай паловы XVII ст. (Ян Вісліцкі, Г. Пельгрымоўскі, Ян Радван і інш.).

